

**Якая роля ў навукі?**
СТАР. 7



**Тэлеперсона — пра сябе і прафесію**
СТАР. 9



**Праграма тэлебачання на тыдзень**
**20 КАНАЛАЎ**

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 КРАСАВІКА 2017 г. ПЯТНІЦА № 80 (28444)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Яго Мсціславец




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У старажытным горадзе над ракой Віхрой — Мсціславе — пастаўлена ажно два помнікі легендарнаму земляку, друкару Пятру Мсціслаўцу, які паклаў пачатак рускаму кнігадрукаванню праз паўвека пасля Скарыны. Аднаму з помнікаў, старэйшаму, сёлета споўнілася 30 гадоў. Постаць летуценнага друкара як дыпломную работу зрабіў выпускнік Беларускай акадэміі мастацтваў, аддзялення скульптуры Мікалай МАЛІНОЎСКІ, які родам з гэтага гістарычнага цэнтра. Цяпер Мікалай Іванавіч жыве ў сваім родным горадзе, займаецца рэстаўрацыяй помнікаў архітэктуры, якіх тут шмат. Час ад часу аўтар прыходзіць да свайго Мсціслаўца. Тут і ўбачыў творцу фотакарэспандэнт «Звязды» Анатоль Кляшчук.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый МАЛАШКА, міністр аховы здароўя:**

*«У Беларусі падрыхтоўцы медыцынскіх кадраў надаецца прыярытэтнае значэнне. Пры гэтым з'яўляецца важным узаемадзеянне ў гэтым пытанні з нашымі найбліжэйшымі суседзямі, калегамі з краін СНД, з якімі ў нас агульныя гістарычныя карані, агульныя традыцыі, агульныя дасягненні. Асаблівую цікавасць для Міністэрства аховы здароўя Беларусі напярэдадні Еўрапейскіх гульняў — 2019 у Мінску ўяўляе вопыт падрыхтоўкі медыцынскіх спецыялістаў для буйных спартыўных мерапрыемстваў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.04.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8763 | ▼ |
| Еўра | 2,0459 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0706 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Стабільны заробак і перспектывы

### Атрымаюць выпускнікі школ, якія выберуць рабочую спецыяльнасць

**Большасць маладых людзей імкнецца атрымаць дыплом аб вышэйшай адукацыі, а рабочыя спецыяльнасці не карыстаюцца папулярнасцю. «І дарма!» — кажа начальнік аддзела кадраў і сацыяльнай работы ўнітарнага прадпрыемства «Мінскводаканал» Нэля ПРЫВАЛАВА. Карэспандэнт «Звязды» наведаў «Мінскводаканал» і высветліў, колькі там атрымліваюць маладыя спецыялісты і як зрабіць такія прафесіі прэстыжнымі.**

***— Нэля Сяргееўна, з якімі навучальнымі ўстановамі супрацоўнічае «Мінскводаканал»?***

— Мы вельмі актыўна ўзаемадзейнічаем з такімі ўстановамі адукацыі, як БНТУ, Мінскі архітэктурна-будаўнічы каледж, Каледж будаўніцтва і камунальнай гаспадаркі, Каледж мантажных і пад'ёмна-транспартных работ, Каледж сферы абслугоўвання, Ліцэй транспартнага будаўніцтва №5 і многімі іншымі. Студэнты прыходзяць да нас на практыку, мы замацоўваем за імі кіраўнікоў, інструктараў. Пасля заканчэння практыкі кіраўнікі пакідаюць водгукі на практыкантаў, а потым, абапіраючыся на іх, мы адбіраем людзей на працу. Таксама наша прадпрыемства прымае ўдзел у рабоце камісій па размеркаванні. А пачынаем мы працэс прыцягнення маладых людзей яшчэ са школы: расказваем пра запатрабаваныя прафесіі, пра наша прадпрыемства.

СТАР. 3

■ Вандроўкі

# ТАЯМНІЦЫ ШТЭТЛА

### У Беларусі з'явіліся яўрэйскія турыстычныя маршруты, але некаторыя аб'екты знікаюць

**Вызначана 20 самых знакавых штэтлаў, альбо былых яўрэйскіх мястэчак, дзе захаваліся аб'екты культурнай яўрэйскай спадчыны. Большасць такіх гарадкоў знаходзіцца ў Гродзенскай вобласці. Упершыню турысты змогуць арганізавана праехаць па гэтых мясцінах, пачуць іх гісторыю, а магчыма, адшукаць магілы сваіх продкаў.**

## СІНАГОГА, ЕШЫБОТ, МІКВА...

Гарадскі пасёлак Радунь — адзін з адрасоў маршруту. Тут жыў знакаміты яўрэйскі філасоф і прапаведнік Хафіц Хаім. Вядомы ён тым, што ў 1869 годзе заснаваў у Радуні яўрэйскую акадэмію — ешыбот, які праславіўся на ўвесь свет. **Работнік Воранаўскага райвыканкама Лілія СІДАРОВІЧ** паведаміла, што яўрэйскія паломнікі і турысты прыязджаюць сюды, каб убачыць той самы ешыбот, але галоўнае — пабываць на магіле вялікага прапаведніка.

СТАР. 5




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Падчас нямецкай акупацыі Гродна сінагога, якая знаходзілася ў цэнтры гета, выкарыстоўвалася нацыстамі як месца збору яўрэяў перад адпраўкай у канцлагеры і на расстрэлы.**

# ФУНДАМЕНТ ДЛЯ БУДУЧЫХ РАШЭННЯЎ

**Сітуацыя ў эканоміцы і фінансах, дрэваапрацоўка і развіццё сельскай гаспадаркі Гомельскай вобласці — гэтыя тэмы сталі ключавымі падчас рабочай сустрэчы кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй праўлення Банка развіцця Сяргеем Румасам.**

— Я хацеў бы, каб вы мне ахарактарызавалі сітуацыю ў эканоміцы і, натуральна, у «крывяноснай сістэме» нашай эканомікі — у фінансах, — звярнуўся Прэзідэнт да суразмоўцы. — Як прафесійны банкір, як фінансіст і як чалавек, які ва ўрадзе прапрацаваў нямала, вы гэта адчуваеце. Я хацеў бы без усялякіх разлікаў, табліц — вашы ўнутраныя перакананні і настроі, звязаныя з сітуацыяй у эканоміцы і фінансах. Магчыма, у вас будуць нейкія факты, якія насцярожваюць, — калі яны ёсць, я хацеў бы, каб вы мне папярэдзілі. Гэта будзе вельмі важна для прыняцця рашэнняў у будучыні. Ваш пункт гледжання або ацэнка, што трэба было б зрабіць у гэтым плане Нацыянальнаму банку, магчыма, і ўраду — каб вы таксама маглі мяне зарыентаваць, тым больш што я вас прасіў, каб вы трымалі руку на пульсе і пастараліся акумуляваць сітуацыю, якая адбываецца ў банкаўскім асяроддзі.

Кіраўнік дзяржавы таксама папрасіў Сяргея Румаса расказаць і пра сітуацыю ў дрэваапрацоўчым холдынгу краіны. Апошні падначалены Банку развіцця і ўключае ў сябе дзевяць вядучых прадпрыемстваў галіны ў краіне: «Барысаўдрэў», «Віцебскдрэў», «Гомельдрэў», «Івацэвічдрэў», «Мастоўдрэў», «Рэчыцадрэў», «ФанДАК», «Магілёўдрэў», «Мазырскі ДАК».

Размова праходзіла пасля паездкі кіраўніка дзяржавы ў Гомельскую вобласць, дзе адбылася сустрэча з Прэзідэнтам Украіны Пятром Парашэнкам. Пралятаючы над Палессем, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на стан палёў. Паколькі Сяргей Румас родам з Гомельшчыны, Прэзідэнт пацікавіўся ходам сельскагаспадарчых работ там:

— Вы памятаеце, мы пачыналі некалі эпапею па адраджэнні на Палессі самай ураджайнай зямлі, у нас яе няшмат. Яна багацейшая, чым чарназём... Што там адбываецца? Увогуле, што земляکі кажуць? Можа, нам яшчэ нейкія захады трэба зрабіць там, на Палессі, — наколькі гэта магчыма? Я толькі што вярнуўся адтуль, бачу, што там адбываецца. Нам трэба на меліяраваных землях вельмі сур'ёзна падыходзіць да севазвароту.

Сяргей Румас далажыў пра вынікі работы Банка развіцця за мінулы год і першы квартал бягучага года, уключаючы даччыныя арганізацыі банка і тыя прадпрыемствы дрэваапрацоўкі, якія былі перададзены банку ў кіраванне. Кіраўнік дзяржавы ўхваліў асноўныя палажэнні стратэгіі развіцця гэтых прадпрыемстваў.

«У найбліжэйшы час з улікам патрабаванняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь мы ўнясём стратэгію на зацвярджэнне выканаўчых органаў банка, — паведамілі журналістам старшыня праўлення Банка развіцця. — Таксама кіраўнік дзяржавы падрабязна заслухаў справаздачу пра выкананне функцый сацыяльнай адказнасці банка. Усе праекты, якія мы рэалізуем, былі падрабязна ім разгледжаны, у прыватнасці праект «Школьны аўтобус». Кіраўніка дзяржавы цікавіла, як прасоўваецца гэтая праграма».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ЗАХАВАЦЬ БЯСПЕКУ

**Падчас сустрэчы Прэзідэнта са старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Валерыем Вакульчыкам абмяркоўваліся пытанні знешняй і ўнутранай бяспекі дзяржавы.**

— Апошнім часам пра бяспеку — знешнюю, і асабліва ўнутраную — сказана нямала, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Год у нас быў няпросты, пачатак гэтага года... Што зараз адбываецца і якія тэндэнцыі ў краіне ў плане ўмацавання бяспекі нашай дзяржавы, перш за ўсё ўнутранай? І натуральна, ваша ацэнка знешняй бяспекі, якая ўплывае і на сітуацыю ўнутры нашай дзяржавы: без усялякіх там купюр, прыхарошвання сітуацыі.

Валерый Вакульчык праінфармаваў Прэзідэнта, як развіваецца абстаноўка ў сферы нацыянальнай бяспекі і якія выклікі ў сувязі з гэтым сёння стаяць перад дзяржавай. Старшыня КДБ таксама прадставіў сваю ацэнку знешняй бяспекі Беларусі, якая, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, уплывае на сітуацыю ўнутры краіны.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# Падпісаны ўказ аб прызыве афіцэраў запасу

На ваенную службу ва Узброеныя Сілы ў 2017 годзе будзе прызвана да 100 афіцэраў запасу сярод мужчын ва ўзросце да 27 гадоў, якія не прайшлі тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве і не маюць права на адтэрміноўку ад прызыву. Адпаведны Указ падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Міністэрству абароны даручана забяспечыць прызначэнне прызваных грамадзян на воінскія пасады ў адпаведнасці з іх ваенна-ўліковымі спецыяльнасцямі.

Савету Міністраў неабходна да 1 лютага 2018 года падаць кіраўніку дзяржавы інфармацыю аб выніках прызыву.

■ Погляд

# ЗВЕРКА ГАДЗІННІКАЎ



## НА ШТО БУДЗЕ ЗАРЫЕНТАВАНА СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ І УКРАІНЫ

Каб прааналізаваць значэнне сустрэчы беларускага і ўкраінскага кіраўнікоў дзяржаў і дасягнутыя дамоўленасці, звернемся да гісторыі супрацоўніцтва Беларусі і Украіны. Адносіны дзвюх краін перажывалі розныя этапы. У пачатку 1990-х назіралася пэўная абыякавасць, калі дзве дзяржавы, якія перажывалі цяжкія наступствы распаду СССР, шукалі ўплывовых партнёраў для аднаўлення сваёй эканомікі і не бачылі адна ў адной пункта апоры. Найбольш праблемнымі яны былі ў 2004—2007 гадах, калі Прэзідэнт Украіны Віктар Ючшанка, які прыйшоў да ўлады пасля майдана, спрабаваў рэалізаваць ідэю каляровай рэвалюцыі на беларускай тэрыторыі. Адметна, што ў далейшым ён ад гэтай ідэі адмовіўся і стаў актыўна лабіраваць паляпшэнне адносін Беларусі з Захадам, за што Прэзідэнт Беларусі неаднаразова выказваў яму ўдзячнасць у наступныя гады.

Мае значэнне і агульная накіраванасць знешняй палітыкі дзвюх краін. З беларускага боку найбольшая цікавасць да Украіны праявілася ў пачатку XXI стагоддзя, калі беларускі экспарт, які рос, запатрабаваў новых буйных рынкаў збыту. Найбольшых поспех былі дасягнуты ў 2012 годзе, калі тавараабарот перавысіў рэкордную суму ў 8 мільярдаў долараў з вялікім станоўчым сальда для Беларусі. З 2013 года пачалося падзенне тавараабароту, які дасягнуў рэкордна нізкіх пазіцый у 2015 годзе і пачаў аднаўляцца толькі ў 2016-м. З 2014 года Беларусь таксама імкнецца прыкласці ўсе намаганні, каб урэгуляваць маштабны палітычны крызіс на тэрыторыі сваёй суседкі. Дамоўленасці, дасягнутыя на высокім узроўні ў лютым 2015 года, і рэгулярныя сустрэчы перагаворшчыкаў супрацьлеглых бакоў адыгралі пазітыўную ролю ў гэтым працэсе.

Так ужо склалася, што ўкраінскае кіраўніцтва традыцыйна нашмат менш аперыруе эканамічнымі катэгорыямі, чым геапалітычнымі, у адносінах з Беларуссю. Да 2014 года Беларусь часта ўспрымалі альбо як закладніцу састарэлага з пункту гледжання кіеўскіх эліт трэнду арыентацыі на Расію, ад якога сама Украіна імкліва адыходзіла, што выклікала спрэчкі ў адносінах Мінска і Кіева, альбо як патэнцыяльнага саюзніка для дзеянняў супраць Расіі. Пасля 2014 года значнасць менавіта геапалітычных ацэнак адносін з Беларуссю для Кіева асабліва ўзрасла. Адначасова стаў набіраць сілу новы трэнд ацэньвання Беларусі як нейтральнай краіны, якая карысная для ўрэгулявання данбаскага крызісу і не нясе пагрозы тэрытарыяльнай цэласнасці Украіны. Для Мінска асабліва важна, каб гэты трэнд дамінаваў у Кіеве, паколькі ён адпавядае прынцыпам добрасуседства і добразычлівасці, якімі Беларусь імкнецца аперыраваць у дачыненні да ўсіх сваіх суседзяў.

У кантэксце гісторыі нашых адносін сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Пятра Парашэнкі адпавядала трэндам, якія склаліся ў апошнія гады. Для ўкраінскага боку было вельмі важна чарговы раз атрымаць запэўніванні, што беларуская палітыка ў дачыненні да Украіны міралюбная і не нясе ніякай небяспекі для Украіны. Паколькі так яно і ёсць, Аляксандр Лукашэнка гэта чарговы раз пацвердзіў. Для беларускага боку найбольшую важнасць мелі пытанні сумесных намаганняў па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы і пытанні эканамічнага супрацоўніцтва. Пытанне цаны чарнобыльскай катастрофы найбольш значнае менавіта для Беларусі, паколькі 70 працэнтаў радыеактыўных выкідаў пасля выбуху АЭС прыпала менавіта на беларускую тэрыторыю. 23 працэнты тэрыторыі Беларусі пацярпелі ад радыяцыі, для параўнання — Украіна пацярпела ад радыяцыйнага забруджвання на 6—8 працэнтах сваёй тэрыторыі. Іншым важным пытаннем з'яўляецца выкарыстанне вопыту чатырох дзейных АЭС Украіны ў будаўніцтве і эксплуатацыі новай Беларускай АЭС. Прэзідэнт Украіны пацвердзіў гатоўнасць максімальна супрацоўнічаць у гэтай сферы.

Што датычыцца кааперацыі ў сферы эканомікі, то яе неабходнасць відавочная. Тавараабарот у мільярды долараў трэба падтрымліваць канкрэтнымі рашэннямі, якія дапамогуць яго захаваць і павялічыць. Першыя месяцы 2017 года ўжо прадэманстравалі сур'ёзную дынаміку ў прыросце як экспарту, так і імпарту ў адносінах з Украінай. Беларусь зацікаўленая ў стварэнні сумесных прадпрыемстваў з украінскім бокам на ўзор ужо існуючых зборачных вытворчасцяў МТЗ, МАЗа, «Гомсельмаша» і «Магілёўліфтмаша» і ў пашырэнні асартыменту прадукцыі, што выпускаецца. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, наша краіна «гатова павялічыць пастаўкі ва Украіну аўтамабільнай і сельскагаспадарчай тэхнікі, угнаенняў і будматэрыялаў. У сваю чаргу мы зацікаўлены ў закупках вырабаў з металу, прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі».

Складваецца ўражанне, што энергічная палітыка Беларусі па развіцці эканамічнага супрацоўніцтва выклікала водгук ва ўкраінскага кіраўніцтва. Хацелася б, каб у наступныя гады менавіта яно стала прыярытэтам нашага супрацоўніцтва па меры ўрэгулявання ваеннага крызісу на ўкраінскай зямлі.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■

# Вырашаем праблемы разам

**Прадстаўнікі ўлады выходзяць на адкрыты дыялог. Па традыцыі ў суботу ва ўсіх рэгіёнах Беларусі пройдуць прамыя тэлефонныя лініі. Графік работы ранейшы — званкі ад грамадзян і юрыдычных асоб 29 красавіка будуць прымаць з 9 раніцы і да паўдня.**

**Брэсцкі аблвыканкам** — намеснік старшыні САКОЎСКІ Віктар Яўгенавіч (80162213121);
**Віцебскі аблвыканкам** — намеснік старшыні АСКЕРКА Віктар Віталевіч (80212222222);
**Гомельскі аблвыканкам** — кіраўнік спраў КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна (80232751237);
**Гродзенскі аблвыканкам** — старшыня КРАЎЦОЎ Уладзімір Васілевіч (80152735644);
**Магілёўскі аблвыканкам** — кіраўнік спраў ВАРОНІН Рыгор Аляксандравіч (80222501869);
**Мінскі аблвыканкам** — старшыня Савета дэпутатаў ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч (80175004160);
**Мінскі гарвыканкам** — намеснік старшыні ЮРКЕВІЧ Ігар Віктаравіч (80172224444).

# ВЫЯЎЛЕНА НОВАЯ ЗАЛЕЖ НАФТЫ

**На Усходне-Дабрагашчанскай плошчы ў Жлобінскім раёне падчас выканання дзяржаўнай праграмы «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў» на 2016—2020 гады дзяржаўным прадпрыемствам «НПЦ па геалогіі» выяўлена новая залеж нафты.**

Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, згодна з папярэдняй інфармацыяй спецыялістаў, атрыманай пры выпрабаванні прадуктыўнага пласта ў пошукавай свідравіне, геалагічныя запасы новай залежы складуць ад 350 да 800 тысяч тон. Больш дакладная ацэнка будзе дадзена па выніках выпрабаванняў, якія зараз праводзяцца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Трамп прапанаваў гістарычнае скарачэнне падаткаў

Белы дом апублікаваў маштабную праграму падатковых скарачэнняў, назваўшы яе «гістарычнай». План прэзідэнта ЗША Дональда Трампа, у прыватнасці, прапануе ўстанавіць падатковыя льготы для сем'яў з дзецьмі і павялічыць суму даходаў сямейных пар, якая не абкладаецца падаткам, з 12,7 тыс. долараў да $24 тыс. Міністр фінансаў ЗША Стывен Мнучын паведаміў, што плануецца таксама знізіць падатак на прыбытак кампаній — як карпарацый, так і малога і сярэдняга бізнесу. Мінфін выказаў упэўненасць у тым, што новая падатковая рэформа «акупіцца» і дазволіць скарацiць нацыянальны доўг ЗША, які перавышае 20 трыльёнаў долараў.

## Карабель ВМФ Расіі затануў пасля сутыкнення каля берагоў Турцыі



Даследчае судна Чарнаморскага флоту «Ліман» затанула пасля сутыкнення з сухагрузам каля берагоў Турцыі. Члены экіпажа не пацярпелі. Сутыкненне адбылося ў паўднёва-заходняй частцы Чорнага мора, за 40 км на паўночны захад ад праліва Басфор. У выніку інцыдэнту «Ліман» атрымаў прабоіну правага борта ніжэй ватэрлініі. Судна, з якім сутыкнуўся расійскі карабель, ходзіць пад сцягам Тога. Паведамляецца, што яно перавозіла жывёлу.

## Венесуэла заявіла аб выхадзе з Арганізацыі амерыканскіх дзяржаў

Кіраўнік МЗС Венесуэлы Дэлсі Радрыгес заявіла, што Каракас ініцыюе выхад краіны з Арганізацыі амерыканскіх дзяржаў (ААД). Па словах міністра, гэтае рашэнне было прынята ў знак нездаволенасці палітыкай ЗША, накіраванай супраць краіны. Выхад Каракаса з ААД зойме два гады. Пастаянны савет Арганізацыі амерыканскіх дзяржаў вырашыў правесці экстранную нараду кіраўнікоў МЗС з мэтай абмеркаваць сітуацыю ў Венесуэле.

## 50 швейцарскіх франкаў прызнаныя банкнотам года



Міжнародная банкнотная супольнасць, якая аб'ядноўвае калекцыянераў папяровых грашовых знакаў, апублікавала вынікі конкурсу «Банкнот года — 2016». Першае месца дасталася купюры ў 50 швейцарскіх франкаў. Канкурэнцыю банкноту-пераможцу склалі, у прыватнасці, выпушчаныя або уведзеныя ў абарачэнне летась адна тысяча мальдыўскіх руфій, 500 аргенцінскіх песа, 100 беларускіх рублёў, пяць шатландскіх фунтаў, пяць фунтаў стэрлінгаў Банка Англіі, 50 новазеландскіх долараў, пяць аўстралійскіх долараў, 50 грузінскіх лары і 100 шведскіх крон.

■ На слыху

# Грамадскі савет абмяркуе падручнікі

**Грамадска-кансультацыйны савет па пытаннях адукацыі пры Міністэрстве адукацыі ўзначаліў доктар педагагічных навук, прафесар, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі.**

У склад савета ўвайшлі прадстаўнікі розных сфер дзейнасці, знаёмыя з сістэмай адукацыі па вучобе ў школе ці ВНУ, па родзе цяперашняй работы або па сваім бацькоўскім статусе: палітыкі, грамадскія дзеячы, медыйныя персоны, кіраўнікі як дзяржаўных, так і прыватных устаноў адукацыі, настаўнікі і рэпетытары са сталіцы і з рэгіёнаў.

Сярод асноўных задач савета — абмеркаванне найбольш важных сацыяльна значных пытанняў дзяржаўнай палітыкі ў сферах адукацыі, дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, пытанняў у галіне ахновы дзяцінства, апекі над непаўналетнімі. Савет стане своеасаблівай пляцоўкай для вызначэння магчымых рызык, якія могуць паўстаць у сістэме адукацыі. Разам з тым мяркуецца, што члены савета будуць знаёміцца з найлепшым вопытам устаноў адукацыі краіны, сустракацца з настаўнікамі і вучнямі.

Адно з пытанняў, вынесеных на першае пасяджэнне, датычылася пачатку вучэбнага дня ў школьнікаў. Статыстыка сведчыць, што прыкладна ў трэцяй частцы агульных сярэдніх навучальных устаноў краіны заняткі пачынаюцца а 8-й гадзіне раніцы, яшчэ столькі ж устаноў пачынаюць урокі ў 8.30 і каля 30% — а 9-й гадзіне. Графік пачатку ўрокаў рэгулюецца санітарнымі нормамі і правіламі. І міністр адукацыі, і члены грамадска-кансультацыйнага савета выказалі меркаванне, што гэта пытанне патрабуе больш дэталёвай прапрацоўкі. Пад увагу трэба браць не толькі магчымасці бацькоў прывесці дзіця ў школу, але і асаблівасці арганізацыі вучэбнага дня ва ўстанове адукацыі: неабходна ўлічваць правядзенне дадатковых заняткаў, факультатываў, выхаваўчых школьных мерапрыемстваў і тое, што ў шэрагу школ навучанне арганізавана ў дзве змены. Акрамя таго, многія школьнікі заняты ў цэнтрах дадатковай адукацыі, спартыўных, музычных і мастацкіх школах.

Мяркуецца, што наступнае пасяджэнне грамадска-кансультацыйнага савета па пытаннях адукацыі пры Міністэрстве адукацыі пройдзе ў Нацыянальным інстытуце адукацыі і будзе прысвечана школьным падручнікам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# Стабільны заробак і перспектывы

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Чым вышэйшы ўзровень адукацыі, тым большы заробак?***

— Не заўсёды. Рабочыя з высокім разрадам атрымліваюць дастойную заработную плату, таму ёсць сэнс паступаць не ў вышэйшую навучальную ўстанову. Дапусцім, электраманцёры па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання, слесары аварыйна-аднаўленчых работ чацвёртага, пятага разраду — у іх зарплата можа быць на ўзроўні спецыяліста або нават кіраўніка. Заробак пастаянна расце са стажам. У нас таксама існуюць розныя бонусы, сацыяльныя гарантыі. Напрыклад, медыцынскае страхаванне. Мы выплачваем прэміі. У нашых работнікаў ёсць перспектывы. Напрыклад, работнік трэцяга раёна па эксплуатацыі водаправодных сетак, пачаўшы працу пасля архітэктурна-будаўнічага каледжа ў якасці слесара, станоўча праявіў сябе, двойчы за тры гады атрымліваў павышэнне і цяпер ужо працуе на інжынернай пасадзе — зарплата даходзіць да 1000 рублёў.

***— Колькі людзей вы размяркоўваеце да сябе?***

— У мінулым годзе прынялі каля 60 маладых спецыялістаў. Мы свае абавязацельствы з навучальнымі ўстановамі выконваем.

***— Як павысіць прэстыж рабочых прафесій?***

— Жыццё паказвае, што калі ў цябе запатрабаваная адукацыя, то ты знойдзеш сабе працу. Трэба казаць пра гэта ў школах, трэба, каб гэта тлумачылі бацькі. Трэба правільна ацэньваць рэальную патрэбу прадпрыемстваў у спецыялістах і рабіць найлепшы выбар.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■ Свет жывёл

# ШЧАСЛІВАЯ СЯМЕЙКА БУША

Унікальная з'ява ў Гродзенскім заапарку

**Упершыню тут з'явіліся на свет птушаняты драпежных птушак. Шчаслівых бацькоў завуць Ушачка і Буш.**



Заходнесібірскіх пугачоў заапарк набыў год таму ў Маскве. У Гродна прывезлі трох птушак — самца і дзвюх самачак, якіх змясцілі ў адзін вальер. Калі сфарміравалася пара, адну самку давялося адсяліць, бо новая сям'я стала адносіцца да яе агрэсіўна.

Праз некаторы час работнікі заапарка заўважылі, што птушкі ўладкавалі гняздо — ямку з галінкамі і пухам, дзе хутка з'явіліся тры яйкі. А напрыканцы сакавіка з іх вылупіліся птушаняты. Спачатку матуля хавала малютак ад старонніх вачэй, але праз месяц яны падраслі і сталі самастойна выходзіць на шпацыр.

— Для Гродзенскага заапарка гэта ўнікальны выпадак, — паведаміў **дырэктар Алег ЖДАНКІН**. — Да гэтага часу за ўсю гісторыю нашай установы пугачы не мелі птушанят, а тут адразу трое. Цікава, што бацька-пугач зверху ахоўвае сямейства, сочыць, каб ніхто іх не пакрыўдзіў. А маці корміць і грэе птушанят.

Пугачы, як вядома, драпежнікі, таму нават малыя харчуюцца мясам. У заапарку для гэтых мэт вырошчваюць дробных грызуноў. Пасля таго, як птушаняты вырастуць, іх перададуць у іншыя заапаркі.

— Зараз шмат хто займаецца ўтрыманнем міні-заапаркаў, асабліва гэта папулярна на аграсядзібах, у зонах адпачынку, — зазначыў Алег Жданкін. — Добра разыходзяцца дэкаратыўныя куры, такія як брама, кахінхін. Ёсць попыт на ліс. Дарэчы, у нас нядаўна нарадзілася трое лісянят. Будзем іх прадаваць. Атрымалі сёлета прыплод ад лам. А на рэдкую чорна-белую альпаку, якая нарадзілася вясной, ёсць запыт з Ніжняга Ноўгарада.

Трэба адзначыць, што пугачы — не адзіная навіна ў Гродзенскім заапарку. Роўна год таму ўпершыню тут нарадзіліся тыграняты — Губерт і Хельга. Сёлета заапарк плануе закупіць яшчэ некалькі асобін сямейства кацiных.

Мараць жыхары Гродна і аб слане. Але набываць яго пакуль не плануюць, бо будынак сланоўніка не поўнасцю абсталяваны, хоць рэканструкцыя заапарка даўно завяршылася. Гэтыя абставіны перашкаджаюць заняцца пошукам слана, якога тут даўно чакаюць. Апошні слон у Гродзенскім заапарку загінуў дзесяць гадоў таму. Ці з'явіцца калі-небудзь новы слон? Гэта пытанне турбуе многіх наведвальнікаў заапарка. Але адказаць на яго пакуль ніхто не можа.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

■ Прыемная навіна

# У ПАДАРУНАК — БАРЦОЎСКАЯ ЗАЛА

**У Сароцкай сярэдняй школе Любанскага раёна адкрыта спецыялізаваная спартыўная зала для заняткаў самба і дзюдо. Гэта стала магчымым дзякуючы былым знакамітым выпускнікам: майстру спорту міжнароднага класа, неаднаразоваму прызёру чэмпіянатаў свету і Еўропы па самба Юрыю Сенажацкаму і прэзідэнту канцэрна «Дзіцячасельскі», што ў Ленінградскай вобласці Расіі, Юрыю Брагінцу.**

— Яны тут нарадзіліся, у свой час закончылі нашу навучальную ўстанову, у вёсцы жывуць іх бацькі. Юрый Аляксандравіч і Юрый Мікалаевіч рэгулярна прыязджаюць на малую радзіму і абавязкова наведваюць школу, — расказала **дырэктар Святлана КАНАНОВІЧ**. — Яны заўсёды цікавяцца, што трэба купіць для дзяцей, іх фізічнага і інтэлектуальнага развіцця. Юрый Брагінец падарыў нам камп'ютарны клас, інтэрактыўную дошку, музычную апаратуру. Па іх ініцыятыве з лютага праходзяць майстар-класы па барацьбе. Пры фінансавай падтрымцы Юрыя Брагінца абсталявана барцоўская зала, куплены форма і інвентар. У красавіку пачала работу спартыўная секцыя групы пачатковай падрыхтоўкі па дзюдо, дзе займаецца 14 дзяцей ва ўзросце 8—12 гадоў.

Трэніруе іх настаўнік па фізічнай культуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, кандыдат у майстры спорту па барацьбе Міхаіл Бакан.

— У найбліжэйшых планах нашых спонсараў аказаць дапамогу па адкрыцці новых барцоўскіх залаў непасрэдна ва ўстановах адукацыі. Цяпер вызначаецца, на базе якіх школ будуць ствараюцца такія залы. Не выключана, што адна з іх з'явіцца ў Любанскай школе №3, — адзначыла **начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму райвыканкама Таццяна КАРАВАЦКАЯ**.

Юныя прыхільнікі дзюдо і самба пасля групы першапачатковай падрыхтоўкі могуць адшліфоўваць сваё майстэрства ў мясцовай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе, дзе прыступіць да работы спецыяліст па гэтых відах адзінаборстваў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

■ Узровень

# Мастацтва верхавой язды

**У разгар каляндарнай вясны Цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту ажывае так актыўна, як і ўсё вакол. Напярэдадні ў Ратамцы адбыўся шэраг знакавых мерапрыемстваў, сярод іх этап Кубка свету, чэмпіянат Беларусі і міжнародны турнір па выездцы.**

У спаборніцтвах прынялі ўдзел 69 спартыўных пар з Беларусі, Расіі, Польшчы і Украіны. Гаспадары заваявалі адразу два дзясяткі медалёў: 7 залатых, 5 сярэбраных і 8 бронзавых узнагарод. Найбольш паспяхова выступіла Ганна Карасёва на кані «Арлекіна», у фінале этапу Кубка свету яна заняла 2-е месца, таксама дуэт стаў чэмпіянам Беларусі. Да гэтых поспехаў Ганна з канём «Задыяк» дадала перамогу на міжнародных спаборніцтвах узроўню 3 зорак.

*— Ганна Карасёва выступіла найбольш паспяхова з нашай каманды. Хоць, вядома, мы чакалі, што яна зможа паўтарыць леташні поспех і заняць першае месца ў фінале гэтага этапу Кубка свету,* — расказвае **галоўны трэнер беларускай каманды Наталля ЮРАНАВА**. *— Справа ў тым, што Карасёва з канём нядаўна вярнулася са спаборніцтваў у Амерыцы і проста не паспела аднавіцца. Але калі казаць увогуле, то вынікам беларускай каманды мы задаволеныя,* — дадала Наталля Альгертаўна.

Зараз нашы спартыўныя пары рыхтуюцца да чэмпіянату Еўропы, які ў жніўні пройдзе ў Швецыі, да гэтага ў іх графіку ўдзел у шэрагу міжнародных турніраў.



Высокі арганізацыйны ўзровень мінулых спаборніцтваў у Ратамцы быў адзначаны міжнароднымі суддзямі і гасцямі Міжнароднай федэрацыі коннага спорту. Адначасова з правядзеннем этапу Кубка свету адбыўся двухдзённы візіт у нашу краіну прэзідэнта Міжнароднай федэрацыі коннага спорту Інгмара Дэ Воса, генеральнага сакратара Сабрыны Ібанэз, памочніка прэзідэнта Люсінды Арсеніа. Госці наведалі спартыўныя аб'екты Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі, сустрэліся са спартсменамі і трэнерамі Беларусі і, вядома, пазнаёміліся з культурнымі славутасцямі сталіцы. Найбольш значным мерапрыемствам стала сустрэча гасцей з намеснікам прэм'ер-міністра краіны — старшынёй Беларускай федэрацыі коннага спорту Міхаілам Русым, віцэ-прэзідэнтам НАК Міхаілам Ананьевым, першым намеснікам міністра спорту і турызму Вячаславам Дурновым. Падчас дыялогу абмяркоўваліся пытанні развіцця коннага спорту ў Беларусі і супрацоўніцтва з Міжнароднай федэрацыяй, адукацыйныя праграмы для ўдасканалення падрыхтоўкі трэнераў, спартсменаў і суддзяў.

Адзначым, што падобны візіт стаў першым для кіраўнікоў Міжнароднай федэрацыі коннага спорту ў краіны Усходняй Еўропы. Сёння гэтая арганізацыя з'яўляецца адной з самых прэстыжных у спартыўным свеце, у яе ўваходзіць 134 нацыянальныя федэрацыі.

Ну а для аматараў аднаго з самых прыгожых відаў спорту нагадваем, што беларуская Ратамка прыме наступныя прэстыжныя спаборніцтвы ўжо ў пачатку чэрвеня, спартсмены будуць змагацца ў адным з самых відовішчных відаў праграмы — трохбор'і.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*


ЛОГОЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**сообщает о проведении 31 мая 2017 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена, руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб. | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Августово, ул. Зеленая, д. 7 623284600201000300 | 0,0999 | газоснабжение, электроснабжение | 3 300.00 | 1 681,31 + реклама | 330,00 |
| 2 | д. Силичи, ул. Лесная, д. 8 623284605401000328 | 0,1458 | газоснабжение | 3 700.00 | 1 872,22 + реклама | 370,00 |
| 3 | д. Силичи, ул. Лесная, д. 10 623284605401000329 | 0,1500 | газоснабжение | 3 700.00 | 1 942,46 + реклама | 370,00 |
| 4 | д. Понизовье, У-1 623284604601000157 | 0,1486 | | 2 500.00 | 1 697,10 + реклама | 250,00 |

Земельный участок в д. Понизовье, У-1 имеет ограничения в использовании площадью 0,1486 га в связи с расположением в водоохранной зоне реки Гайна и земельный участок в д. Августово, ул. Зеленая, д. 7 имеет ограничения в использовании площадью 0,0020 га в связи с расположением в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения.

Задаток в размере 10% от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с 3600619101103 в ЦБУ №611 филиала №500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, код 795, УНП 600537220, код 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 31 мая 2017 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6. Последний день приема заявлений 25 мая 2017 года до 17.00. Контактные телефоны: (801774) 28473, (8029) 177 95 11.

■ Урбаністыка

У сталіцы пройдзе фестываль ландшафтнай архітэктуры і дызайну

# Плывучыя шпакоўні, гіганцкія шахматы і самаробныя фантаны

**З 1 па 10 мая ў Верхнім горадзе разгорнецца маштабны фэст. Тут будуць выстаўлены разнастайныя малыя архітэктурныя формы, скульптурныя кампазіцыі сучасных беларускіх аўтараў, прадстаўлены ландшафтныя праекты. Аднак гэта далёка не адзінае, чым гатовыя здзіўляць арганізатары фестывалю...**



Экспанаты леташняга фестывалю.

Як паведаміў адзін з ідэйных натхняльнікаў мерапрыемства **архітэктар Юрый ТАЎБКІН**, асноўнае дзейства разгорнецца на вуліцах Зыбіцкай, Герцэна, Кірылы і Мяфодзія. Магчыма, калі ўдасца вытрымаць канкурэнцыю, будзе задзейнічана і Ратушная плошча: на гэтыя майскія дні ў сталіцы, у прыватнасці ў Верхнім горадзе, запланавана мноства розных мерапрыемстваў, як, напрыклад, Дні беларускай культуры.

— Тыдзень дызайну праходзіў у Мінску ўжо не раз. Падчас аднаго з іх арганізатарам прыйшла думка частку яго прысвяціць урбаністыцы і, адпаведна, вынесці выставы і актыўнасці на вуліцу. Як аналаг — тая ж Zona Tortona ў Мілане. Мы хацелі паказаць, як дызайн фарміруе асяроддзе пражывання чалавека. Першую экспазіцыю два гады таму мы зрабілі ў Траецкім прадмесці, і гэтая ініцыятыва вельмі спадабалася гарадскім уладам. Потым быў фестываль архітэктуры, які ўжо перанеслі ў Верхні горад. Паступова падобныя мерапрыемствы, як і зона іх правядзення, становяцца традыцыйнымі, — расказаў Юрый Таўбкін.

Сёлета ў якасці галоўных тэм фестывалю ландшафтнай архітэктуры і дызайну выбрана адразу тры: 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, 950-годдзе горада Мінска і... шахматы. Дні правядзення фестывалю якраз супадаюць з буйным шахматным турнірам, так што «ў тэму» сталіцу ўпрыгожаць велізарныя ігравыя фігуры. Абавязковай умовы — кіравацца толькі гэтай тэматыкай — для аўтараў не было, тым не менш многія палічылі цікавым узяць яе за аснову.

— Далучэнне да сучаснай культуры «непазбежна» выхоўвае ў людзях густ, так што падобныя мерапрыемствы неабходныя. Я не веру ў рэвалюцыі, па меншай меры, у сферы дызайну. Тут усё ідзе эвалюцыйным шляхам: беларускія аўтары навучыліся як хутка ўлоўліваць і пераймаць агульнасусветныя тэндэнцыі, так і ствараць нешта ўнікальнае. Сярод асноўных трэндаў, якія ўласцівыя некалькім апошнім гадам, можна назваць актыўную цікавасць да нацыянальнай сімволікі і традыцый, якія з'яўляюцца ідэнтыфікацыйнымі, і прымяненне натуральных матэрыялаў, якія прыгожа ста́рацца. З упэўненасцю можна сказаць, што ўзровень работ штогод істотна павышаецца, — паведаміў архітэктар.

Што ж хаваецца за загадкавым паняццем «малыя архітэктурныя формы»? Усё, што мае дачыненне да арганізацыі гарадской прасторы: лавачкі, велапаркоўкі, арэлі, падвесныя крэслы, урны, а таксама скульптуры і інсталяцыі. І ўсё гэта можна будзе не толькі памацаць, але і праверыць на трываласць і зручнасць.

— Што датычыцца ландшафтнага дызайну, то акрамя фотавыставы гатовых праектаў пройдзе яшчэ і конкурс візуалізаваных ідэй. Заяўку на ўдзел ужо падало больш як 30 ахвотных. Ацаніць майстэрства прафесіяналаў сваёй справы можна будзе ў Археалагічным музеі і яго дворыку. Ёсць шмат думак, як можна пераўтварыць, у тым ліку і гарадскую прастору, з дапамогай ландшафту. Гэта і монапасадкі шматгадовых хмызнякоў, і іх дэкаратыўная стрыжка, і габеоны — выходзіць значна танней за дарагія кветкавыя кампазіцыі, якія штогод прыходзіцца ствараць зноўку, а ў многіх выпадках і больш стыльна. Але ў цэлым у гэтым плане наша сталіца рухаецца ў правільным кірунку, — адзначыла **ландшафтны дызайнер, член Асацыяцыі спецыялістаў ландшафтнай індустрыі Беларусі Вольга НЕСЦЯРУК.**

У праграме фестывалю таксама прадугледжаны лекцыйная частка, ландшафтны форум і майстар-класы ад вядучых дызайнераў, напрыклад па стварэнні модульнай ландшафтнай кампазіцыі, доглядзе ягадных хмызнякоў і ўзвядзенні міні-фантана. Тэмы асабліва актуальныя ў пачатку дачнага сезона. Тут жа будзе выстаўлена прадукцыя беларускіх гадавальнікаў раслін.

Тыя, хто пакуль не абзавёўся ўласным участкам або проста далёкі ад гэтай сферы, таксама змогуць знайсці сабе занятак па душы. Фестываль будзе праходзіць у суправаджэнні жывой музыкі і вулічных танцаў. Адна са сталічных ёга-студый правядзе майстар-клас па дыхальных тэхніках, падчас якога можна будзе пракансультавацца з інструктарам.

— Мы пастараемся задзейнічаць усю тэрыторыю Верхняга горада па максімуме. Летась мінчан узбударажылі кампазіцыі на паверхні ракі Свіслач, у гэтым годзе, хутчэй за ўсё, на іх месцы з'явяцца плывучыя домікі для птушак. Тыя прадметы ландшафтнага дызайну, якія выклікаюць найбольшую цікавасць, застануцца ў горадзе на ўвесь сезон, да Дня горада. А нешта, магчыма, і на больш працяглы тэрмін: як, напрыклад, інсталяцыі Паўла Вайніцкага, якія на доўгі час знайшлі сваё месца каля адной з гімназій на праспекце Незалежнасці, — заўважыў Юрый Таўбкін.

На ўсе мерапрыемствы фестывалю ўваход свабодны, а ўдзел у іх бясплатны.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

■


## ИЗВЕЩЕНИЕ

**о проведении 29 мая 2017 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белбакалея»**

| |
|---|
| **Предмет торгов №1** |
| «Компрессорная» с инв. номером 350/С-154527 общей площадью 48 кв. м; назначение: здание неустановленного назначения; «Наклонная галерея» с инв. номером 350/С-154547 общей площадью 156 кв. м; назначение: здание неустановленного назначения; «Растворо-бетонный узел» с инв. номером 350/С-154548 общей площадью 359 кв. м; назначение: здание неустановленного назначения |
| Площадь земельного участка – 0,4566 га, кадастровый номер 340100000002001898 |
| Местонахождение – г. Гомель, пер. Строителей, 3 |
| Начальная цена – 95 212,90 белорусского рубля без учета НДС |
| Сумма задатка – 9 500,00 белорусского рубля |
| **Предмет торгов №2** |
| «Помещение №1» с инв. номером 350/D-218110 общей площадью 189,1 кв. м; назначение: помещение неустановленного назначения; «Помещение №2» с инв. номером 350/D-218169 общей площадью 186,2 кв. м; назначение: помещение неустановленного назначения; «Помещение №3» с инв. номером 350/D-218209 общей площадью 189,8 кв. м; назначение: помещение неустановленного назначения; «Помещение №4» с инв. номером 350/D-218229 общей площадью 192,6 кв. м; назначение: помещение неустановленного назначения |
| Местонахождение – Гомельская область, г. Гомель, ул. Проезжая 3-1, 3-2, 3-3, 3-4 |
| Начальная цена – 118 901,10 белорусского рубля без учета НДС |
| Сумма задатка – 11 900,00 белорусского рубля |
| **Предмет торгов №3** |
| «Здание бытового помещения» с инв. номером 240/С-39076 общей площадью 354,8 кв. м; назначение: здание неустановленного назначения; «Здание растворно-бетонного узла» с инв. номером 240/С-39075 общей площадью 169,3 кв. м; назначение: здание неустановленного назначения; «Здание теплового пункта» с инв. номером 240/С-39074 общей площадью 79,3 кв. м; назначение: здание неустановленного назначения; «Здание гаража» с инв. номером 240/С-39073 общей площадью 159,3 кв. м; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта; «Водопроводная сеть» с инв. номером 240/С-41297; назначение: сооружение специализированное водохозяйственного назначения; «Канализационная сеть» с инв. номером 240/С-41296; назначение: сооружение специализированное водохозяйственного назначения |
| Площадь земельного участка – 0,5112 га, кадастровый номер 242400000001000460 |
| Местонахождение – Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Жан-Поля Марата, 101А |
| Начальная цена – 114 369,69 белорусского рубля без учета НДС |
| Сумма задатка – 11 400,00 белорусского рубля |

**Продавец имущества:** ОАО «БЕЛБАКАЛЕЯ», ул. Промышленная, 15, 220075, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «БЕЛБАКАЛЕЯ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 29 мая 2017 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 28.04.2017 по 25.05.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017)327-48-36
(Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»)
(017) 345-55-44, (029)198-82-09 (ОАО «БЕЛБАКАЛЕЯ»).



## ИЗВЕЩЕНИЕ

**о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков на территории Третьяковского сельского совета в частную собственность**

Аукцион состоится в 11.00 31 мая 2017 г. в г. Лида по ул. Советской, 8.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209,
с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 26 мая 2017 г. до 15.00.
Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». http://grodnoino.by/

| **Номер лота** | **1** | **2** | **3** |
|---|---|---|---|
| **Адрес земельного участка, кадастровый номер** | Лидский район, Третьяковский сельсовет, аг. Едки, позиция 53, 423685403125000302 | Лидский район, Третьяковский сельсовет, аг. Едки, позиция 34, 423685403125000326 | Лидский район, Третьяковский сельсовет, аг. Едки, позиция 40, 423685403125000330 |
| **Право на земельный участок** | право частной собственности | право частной собственности | право частной собственности |
| **Площадь, га** | 0,1012 га | 0,1208 | 0,1120 га |
| **Начальная цена земельного участка, руб.** | 2 339,98 р. (две тысячи триста тридцать девять рублей девяносто восемь копеек) | 2 793,16 р. (две тысячи семьсот девяносто три рубля шестнадцать копеек) | 2 589,69 р. (две тысячи пятьсот восемьдесят девять рублей шестьдесят девять копеек) |
| **Задаток, руб.** | 234 р. (двести тридцать четыре рубля) | 279 р. (двести семьдесят девять рублей) | 259 р. (двести пятьдесят девять рублей) |
| **Дополнительное условие** | Возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта земельного участка – 315,89 руб.; за землеустроительное дело по восстановлению границы земельного участка для проведения аукциона – 308,70 руб. | Возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта земельного участка – 315,89 руб.; за землеустроительное дело по восстановлению границы земельного участка для проведения аукциона – 310,84 руб. | Возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта земельного участка – 315,89 руб.; за землеустроительное дело по восстановлению границы земельного участка для проведения аукциона – 324,50 руб. |

| **Номер лота** | **4** | **5** |
|---|---|---|
| **Адрес земельного участка, кадастровый номер** | Лидский район, Третьяковский сельсовет, аг. Едки, позиция 36 423685403125000356 | Лидский район, Третьяковский сельсовет, аг. Едки, позиция 64 423685403125000362 |
| **Право на земельный участок** | право частной собственности | право частной собственности |
| **Площадь, га** | 0,1179 га | 0,1012 га |
| **Начальная цена земельного участка, руб.** | 2 726,11 (две тысячи семьсот двадцать шесть рублей одиннадцать копеек) | 2 339,97 (две тысячи триста тридцать девять рублей девяносто семь копеек) |
| **Задаток, руб.** | 273 р. (двести семьдесят три рубля) | 234 р. (двести тридцать четыре рубля) |
| **Дополнительное условие** | возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта земельного участка – 315,89 руб.; за землеустроительное дело по восстановлению границы земельного участка для проведения аукциона – 311,72 руб. | возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта земельного участка – 315,89 руб.; за землеустроительное дело по восстановлению границы земельного участка для проведения аукциона – 308,70 руб. |

Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки)

**Условия проведения аукциона в части продажи земельных участков в частную собственность**

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:
- в течение десяти рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:
- внести плату за земельный участок;
- возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка, государственной регистрацией создания этого участка;
- осуществить в течение двух месяцев после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся государственную регистрацию прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок;
- при невыполнении требований об обращении в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся за государственной регистрацией земельного участка и прав на него, результаты аукциона аннулируются;
- в установленном законодательством порядке получить разрешение на выполнение проектно-изыскательских и строительных работ по строительству одноквартирного жилого дома;
- в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию данного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);
- возместить затраты в соответствии с решением Лидского районного исполнительного комитета от 28 марта 2016 г. № 282 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры»;
- строительство одноквартирного жилого дома завершить в течение трех лет с даты осуществления государственной регистрации права частной собственности на данный земельный участок;
- предупредить победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона, что право частной собственности на земельный участок прекращается:
- при неуплате земельного налога по истечении двух налоговых периодов;
- при использовании земельного участка не по целевому назначению;
- если гражданин в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок не приступил к занятию данного участка;
- при неосуществлении мероприятий по охране земель, указанных в части первой статьи 89 Кодекса Республики Беларусь о земле;
- при прекращении гражданства Республики Беларусь

Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь.
Шаг аукциона – 5% от предыдущей цены.
Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:
- заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;
- копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или доверенного лица;
- доверенность, заверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физ. лица.
При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Номер р/с для перечисления задатка для участия в аукционе по продаже земельных участков в частную собственность и по продаже права аренды земельных участков – р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225

# ТАЯМНІЦЫ ШТЭТЛА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яшчэ адным месцам паломніцтва стаў аграгарадок Індура Гродзенскага раёна. У сельскім Савеце расказалі, што турыстаў цікавяць мясцовыя могілкі, дзе захаваліся пліты XVIII стагоддзя. Аказваецца, у гэты час Індура лічылася адным з цэнтраў хасідызму. Гэты кірунак іўдаізму прапаведуе асаблівую рэлігійнасць і набожнасць. Былое мястэчка выклікае цікавасць яўрэяў-хасідаў. Тут захаваўся будынак сінагогі, воднага рэзервуара для ачышчэння (міквы), гістарычная забудова. У пачатку XX стагоддзя гэта быў пасёлак, дзе яўрэйскае насельніцтва складала асноўную частку жыхароў.

Вядома, уключаны ў маршрут і гарадскі пасёлак Мір. Толькі тут захаваўся адзіны ў Беларусі комплекс — дзве сінагогі, школа, а таксама будынак кагалу (органа самакіравання) і ешыбота. Пра мястэчка многае можа расказаць **Віктар САКЕЛЬ — гаспадар прыватнага музея**, большасць экспанатаў якога складаюць прадметы яўрэйскага побыту. Ён іх сам і знаходзіў. Ёсць у яго музеі нават пазалочаная скруткі Торы з цялячай скуры, срэбны посуд, з якога пілі віно. Дзецям дазвалялася пакаштаваць напітак з 13 гадоў, але толькі па пятніцах. Дарэчы, сам будынак музея — былая яўрэйская карчма.

З мястэчкам Мір звязаны лёс цікавага чалавека — Освальда Руфайзена, які меў дачыненне да ўцёкаў вязняў Мірскага гета напярэдадні масавага расстрэлу. У будучым каталіцкі святар, ён стаў прататыпам персанажа вядомага біяграфічнага рамана пісьменніцы Людмілы Уліцкай «Даніэль Штайн. Перакладчык».

У Мірскім замку, дзе ў гады вайны знаходзілася гета, цяпер адкрыта экспазіцыя «Мірскае гета». У музеі Віктара Сакеля трагічны лёс яўрэйскага насельніцтва сімвалізуюць расплаўленыя і абгарэлыя бутэлькі і шклянкі, якія ён знайшоў на месцы згарэлай у гады вайны аптэкі. Пасля вайны яўрэі вярталіся дамоў, але многія затым з'ехалі ў Ізраіль.

## ВЯРТАННЕ НА ЗЯМЛЮ ПРОДКАЎ

Зараз беларускі бок можа прапанаваць маршрут па штэтлах, які падрыхтаваны ў рамках праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Польшча—Беларусь—Украіна.

— Мы маем маршрут, дзе сабраны матэрыял па 20 мястэчках, — гаворыць **удзельнік праекта, загадчык кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Сяргей ПІВАВАРЧЫК**. — Амаль усе яны знаходзяцца ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях — Дзятлава, Жалудок, Іўе, Кобрын, Лунна, Мір, Навагрудак, Індура, Радунь, Пружаны, Слонім і іншыя. Яшчэ па 20 маршрутах распрацаваны напрамак партнёрамі з Польшчы і Украіны. Для тых, хто хоча больш даведацца пра яўрэйскую спадчыну Усходняй Еўропы, існуе трансгранічны маршрут.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вялікая харальная сінагога ў Гродне.

**У ТЭМУ**

**Мікалай РОЗУМ, старшыня Воранаўскага райвыканкама:**

— Мы вядзём перагаворы з яўрэйскімі інвестарамі, якія маюць намер стварыць у Радуні турыстычны цэнтр. Якраз у красавіку будуць вызначаны межы ўчастка, які выдзяляецца каля старых яўрэйскіх могілак. Згодна з праектам, які прайшоў узгадненні, тут плануецца пабудаваць 10—12 гасцявых домікаў, гасцініцу, рэстаран. Таксама разглядаецца пытанне аб перадачы яўрэйскай абшчыне будынка былога ешыбота, там цяпер месціцца Дом культуры. Мы гатовы гэта зрабіць, але з умовай, што для ўстановы культуры будзе ўзведзены новы будынак.

**Таісія КОЦКАЯ, дырэктар турыстычнай фірмы:**

— У нас ёсць пастаянная група турыстаў-яўрэяў, якія арганізавана збіраюцца з усяго свету — Аргенціны, Канады, ЗША, Ізраіля, і прыязджаюць сюды на так званы «настальжы-тур». У Беларусі яны наведваюць тыя мясціны, дзе нарадзіліся і жылі. У асноўным гэта гарады Мір, Слонім, Навагрудак... Часцей былыя жыхары прыязджаюць сем'ямі. Многія наведваюць святыя месцы, якія звязаны з імёнамі равінаў і прапаведнікаў.



Сінагога XIX стагоддзя ў Поразаве Свіслацкага раёна.

Падрыхтоўкай новага турыстычнага прадукту беларускія навукоўцы займаліся два гады. За гэты час было арганізавана некалькі экспедыцый па былых штэтлах, сабраны звесткі, выдадзены кнігі-даведнікі, падрыхтавана 35 экскурсаводаў. З'явіўся і віртуальны прадукт — тры турыстычныя маршруты па месцах яўрэйскай спадчыны Беларусі, Польшчы, Украіны. Створана 15 віртуальных трохмерных макетаў гістарычных гарадоў. Удзельнік праекта паведаміў, што інтарэс да новага кірунку праяўляюць турыстычныя фірмы. Гаспадары некаторых аграсядзіб дадаюць у меню стравы яўрэйскай кухні. Напрыклад, аграсядзіба ў Ашмянах, якая працуе каля былой сінагогі.

Віктар Сакель заўважае, што апошнім часам гарадскі пасёлак Мір, у тым ліку і яго музей, часта наведваюць нашчадкі былых жыхароў. Яны спадзяюцца адшукаць не толькі магілы сваіх продкаў, але і дамы, дзе яны жылі. Калі могілкі захаваліся амаль паўсюдна, то старыя яўрэйскія забудовы зносяцца. Такі вывад зрабілі падчас экспедыцыі ўдзельнікі праекта.

— На жаль, яўрэйская спадчына знікае, — перажывае Сяргей Піваварчык. — Бывае, што жылыя забудовы зносяцца. Напрыклад, так адбылося ў Астрыне. У населеным пункце за кароткі тэрмін знеслі тры яўрэйскія дамы, якія складалі цікавы ландшафтны комплекс.

Ці не атрымаецца так, што ад яўрэйскай спадчыны застануцца толькі могілкі, — задаецца пытаннем навуковец. А між іншым менавіта тыповыя штэтлы сфарміравалі сучасны выгляд многіх гарадкоў і пасёлкаў. Падняць гэты пласт гістарычнай спадчыны магчыма, калі падключацца мясцовыя ўлады, грамадскія арганізацыі. Настальгічны турызм варта падтрымаць, тым больш, што паміж Ізраілем і Беларуссю з лістапада 2015 года дзейнічае бязвізавы рэжым.

— Варта паставіць шыльды, развіваць інфраструктуру, каб турысты пакінулі тут свае грошы, — лічыць Сяргей Піваварчык. — Бо гэта садзейнічае развіццю рэгіянальнай эканомікі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

■ Жыццёвае асяроддзе

# ДРУГОЕ ДЫХАННЕ КАЛОДЗІШЧАЎ

## У Мінскай вобласці працягваецца добраўпарадкаванне малых гарадоў

**У Мінскім раёне месцяцца населеныя пункты, якія па колькасці жыхароў можна параўнаць з сярэднімі райцэнтрамі: Міханавічы, Мачулішчы, Калодзішчы, Гатава, Бараўляны... Штогод яны прырастаюць насельніцтвам, жыллём, але інфраструктура, дарогі не адпавядаюць сучасным патрабаванням. Таму на Міншчыне распрацавана праграма добраўпарадкавання малых гарадоў. Практычна ўжо завершаны работы ў пасёлку Бараўляны і аграгарадку Лясны. Тут упарадкаваны дарожныя развязкі, вуліцы, дваровыя тэрыторыі.**

І вось прыйшла чарга пасёлка Калодзішчы. З гэтай нагоды ў мясцовым культурна-спартыўным комплексе прайшло абмеркаванне Плана мерапрыемстваў па комплексным добраўпарадкаванні. Удзел у ім узялі прадстаўнікі Мінаблвыканкама, Мінскага райвыканкама, грамадскасці, мясцовыя жыхары.

Добраўпарадкаванне разлічана на тры гады — з 2017-га па 2019-ы. Чацвёрты, 2020 год, будзе, як кажуць, запасным, на той выпадак, калі ўсе работы з нейкіх прычын не змогуць завяршыць у азначаныя тэрміны. Па папярэдніх разліках, каб выканаць запланаванае, сёлета спатрэбіцца 106 млн рублёў, 29 млн 356 тыс. рублёў ужо выдзелены з рэспубліканскага бюджэту. Фінансаванне на наступны год складзе каля 50 млн рублёў, а ў 2019-м — крыху больш як 32 мільёны.

Пры гэтым **старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА** нагадаў, што трэба рэальна ацэньваць сітуацыю: «Бюджэт у нас плануецца штогод, таму не варта забягаць наперад. Мы можам быць упэўненыя толькі ў тым, што зможам зрабіць сёлета, паколькі на гэта ўжо выдаткаваны сродкі. Далей будзем вызначацца з крыніцамі фінансавання. А пры неабходнасці — карэктаваць план».

Жыхароў населенага пункта перш за ўсё хвалюе стан дарог. У пасёлку Калодзішчы-2, больш вядомым як «палігон», дзе ўзнікла жылая забудова, самая праблемная вуліца Энтузіястаў. Яе працягласць каля шасці кіламетраў.

— Сёлета плануем уладкаваць тут пясчана-гравійнае пакрыццё, а да адзнакі ў тры кіламетры пакрыць палатно ахоўным слоем асфальту, — адзначыў **дырэктар ЖКГ Мінскай вобласці Валерый ХАХЛОЎ**. — Астатняя частка будзе заасфальтавана пасля будаўніцтва сістэмы цэнтральнага водазабеспячэння.

Усяго ў пасёлку 272 вуліцы, у тым ліку 26 з асфальта-бетонным пакрыццём, 246 — з гравійным. У план па добраўпарадкаванні ўключаны 229 вуліц, у тым ліку на некаторых з іх прадугледжваецца капітальны рамонт. У прыватнасці, вуліцу Цюленіна мяркуюць пашырыць да дзвюх палос у кожным напрамку, а таксама ўладкаваць тут веласіпедныя дарожкі, тратуары, асвятленне.

У Калодзішчах-2 пражывае больш як 300 дзяцей. Адна з жанчын звярнулася да ўлад ад імя жыхароў з просьбай арганізаваць школьны аўтобус: для дзяцей ствараюць небяспеку грузавыя машыны. **Начальнік упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Галіна КАЗАК** растлумачыла, што ў мясцовай школе вучыцца толькі дзесяць дзяцей, якіх бацькі падвозяць сюды на машынах. Астатнія наведваюць школу ў Мінску. Школьны аўтобус, у якім 25 месцаў, не вырашыць праблему. Таму з 1 верасня гэтага года будзе арганізаваны рэйсавы маршрут аўтобуса.

Другі ўдзельнік абмеркавання выказаўся супраць узвядзення машынабудаўнічага завода. Маўляў, баімся, што вытворчасць будзе забруджваць навакольнае асяроддзе, паветра.

— Не так даўно я пабываў на гэтым аб'екце. І калі ён будуецца, то праект прайшоў неабходныя экспертызы, яго зацвердзілі ўсе інстанцыі, экалагічная, санітарная службы. Значыць, тут захаваны ўсе нормы і правілы, — супакоіў яго Сямён Шапіра. — Завод будзе пабудаваны. З'явяцца новыя рабочыя месцы, павялічацца падаткі ў раённы бюджэт.

Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна нагадаў, што ў Пухавіцкім раёне ў свой час людзі былі супраць узвядзення прадпрыемства «Аўгуст-Бел», якое выпускае хімічныя сродкі аховы раслін. Сёння на тэрыторыі яго чысціня, парадак, захаваны ўсе экалагічныя і санітарныя нормы, а сярэдняя зарплата — 1200 рублёў. «Не спяшайцеся з вывадамі, любое аналагічнае пачынанне перш за ўсё накіравана на павышэнне якасці жыцця і дабрабыту людзей», — канстатаваў старшыня Мінаблвыканкама.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА»

**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего предприятию на праве хозяйственного ведения, со снижением начальной цены**

| | |
|---|---|
| **Лот №1** | Легковой вагон Volkswagen Multivan, номер кузова WV2ZZZ7HZ8H038690, 2007 г.в. Цвет – темно-синий металлик; тип КП – АКП; количество мест – 4 пассажирских места + 2. Двигатель – дизельный. Объем двигателя – 2460 см³. Разрешенная масса, max – 3000 кг. Транспортное средство на ходу. Находится по адресу: г. Минск, ул. Чапаева, 4. **Начальная цена – 19 373,43 бел. руб. Задаток – 968,67 бел. руб.** |
| **Лот №2** | Автомобиль Volkswagen Polo, номер кузова WVWZZZ9NZ3Y005797, 2003 г.в. Тип ТС – легковой хэтчбэк. Цвет – черный. Двигатель – бензиновый. КПП – механическая. Количество мест – 5. Количество дверей – 3. Оборудование – автомагнитола. Шины – летние. Диски – штампованные. Транспортное средство не на ходу. Находится по адресу: г. Минск, ул. Чапаева, 4. **Начальная цена – 4 425,06 бел. руб. Задаток – 221,25 бел. руб.** |
| **Лот №3** | Автомобиль грузовой специальный КАМАЗ 4310 номер кузова 4310004310788 с буровой установкой УРБ-2,5А. г.в. – 1988. Показания одометра – 4859,2 км. Транспортное средство не на ходу. Находится по адресу: г. Минск, ул. Чапаева, 4. **Начальная цена – 3 024,00 бел. руб. Задаток – 151,20 бел. руб.** |
| **Лот №4** | Оборудование отраслевой лаборатории радиационной безопасности. Находится по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 25. С полным перечнем оборудования, входящего в состав лота, можно ознакомиться у Организатора торгов. Обременение: Аренда. Договор аренды на срок до 31.05.2017. **Начальная цена – 2 647,97 бел. руб. Задаток – 132,40 бел. руб.** |

УСЛОВИЯ

Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов согласно действующему законодательству.

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Затраты, связанные со снятием транспортного средства с учета, несет Победитель аукциона (Претендент на покупку).

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 11.05.2017 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, д. 25, каб. 209. Шаг аукциона – 5%**

**Задаток перечисляется на р/с 3012001673822 в ОАО «Белинвестбанк» ЦБУ №538 г. Минск, код 739. Получатель – РУП «Жилкоммунтехника», УНП 100135569. Назначение платежа: Задаток для участия в аукционе по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника» (Лот №__), проводимом 11 мая 2017 г.**

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.30 до 17.30 по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 25, каб. 209. Окончание приема заявлений 06.05.2017 в 12.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Сайко Андрей Геннадьевич, тел. 8 (044) 552-42-92.

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 №415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» и Положения об организации и проведении аукционов. Более подробную информацию можно получить у Организатора аукциона.

Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 18.10.2016, 13.05.2016, 05.07.2016.

Перечень документов, необходимых для участия в аукционе, можно получить по e-mail: jkt@tut.by

**☎ Организатор аукциона (Продавец): 8 (017) 204-71-51, 8 (029) 395-36-35 • e-mail: jkt@tut.by**



Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска полис по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БНК №1157773 **считать недействительным.**

УНП 100122726


## ОТЧЕТ ПРЕДПРИЯТИЯ (ОРГАНИЗАЦИИ) ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат» за 2016 год

Учетный номер плательщика: **600075003**.
Вид экономической деятельности: **производство сахара**.
Организационно-правовая форма: **частная**
Орган управления: **концерн «Белгоспищепром»**.
Единица измерения: **тыс. руб.**
Адрес: **223610, г. Слуцк, ул. Головащенко, 6**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2017 года

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2016 года | На 31 декабря 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства (01 минус 02) | 110 | 118548 | 111300 |
| Нематериальные активы (04 минус 05) | 120 | 509 | 545 |
| Доходные вложения в материальные активы (03 минус 02) | 130 | 249 | 532 |
| Вложения в долгосрочные активы (08, 07) | 140 | 4062 | 5532 |
| Долгосрочные финансовые вложения (06) | 150 | 15380 | 5272 |
| Отложенные налоговые активы (09) | 160 | 2 | 3 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность (60, 62, 76 минус 63) | 170 | 797 | 859 |
| Прочие долгосрочные активы (97) | 180 | 94 | 425 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **139641** | **124468** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 82934 | 44101 |
| Расходы будущих периодов (97) | 230 | 683 | 190 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам (18) | 240 | 435 | 1065 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 31031 | 27137 |
| Краткосрочные финансовые вложения (58) | 260 | 38605 | 4596 |
| Денежные средства и их эквиваленты (50, 51, 52, 55, 57, 58) | 270 | 23009 | 31126 |
| Прочие краткосрочные активы (94) | 280 | 1 | 1 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **176698** | **108216** |
| **БАЛАНС** | **300** | **316339** | **232684** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал (80) | 410 | 66515 | 43688 |
| Резервный капитал (82) | 440 | 315 | 315 |
| Добавочный капитал (83) | 450 | 34371 | 47703 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) (84) | 460 | 71364 | 53182 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода (99) | 470 | | |
| Целевое финансирование (86) | 480 | | |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **172565** | **144888** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы (67) | 510 | 2650 | 7616 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам (76) | 520 | | |
| Отложенные налоговые обязательства (65) | 530 | 11 | 11 |
| Доходы будущих периодов (98) | 540 | | |
| Резервы предстоящих платежей (96) | 550 | | |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | 5364 | 7076 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **8025** | **14703** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы (66) | 610 | 40831 | 39025 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 29971 | 7606 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 59933 | 21446 |
| Обязательства, предназначенные для реализации (76/7) | 640 | | |
| Доходы будущих периодов (98) | 650 | 5014 | 5016 |
| Резервы предстоящих платежей (96) | 660 | | |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | | |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **135749** | **73093** |
| **БАЛАНС** | **700** | **316339** | **232684** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 января 2017 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь - декабрь 2016 года | За январь - декабрь 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 233949 | 185555 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (187766) | (143096) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 46183 | 42459 |
| Управленческие расходы | 040 | (4770) | (3574) |
| Расходы на реализацию | 050 | (8365) | (7131) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 33048 | 31754 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 112157 | 81440 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (115317) | (86692) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | 29888 | 26502 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 85181 | 97370 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (76764) | (91140) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 18825 | 35562 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (31682) | (45477) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130) | 140 | (4440) | (3685) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | 25448 | 22817 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию, руб | 250 | 41 | 54 |

### Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности по состоянию на «1» января 2017 г.

4. Доля государства в уставном фонде эмитента **51,00** (всего, в процентах), в том числе:

| Вид собственности | Количество акций, шт. | Доля в уставном фонде, % |
|---|---|---|
| Республиканская | 260960 | 51,00 |

5-6. Информация о дивидендах и акциях:

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 5856 | 5868 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 21 | 21 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | | |
| в том числе: физических лиц | лиц | 5835 | 5847 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 16 | 16 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 2668,87 | 3288,96 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 2646,03 | 3263,87 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 7,941671 | 9,786853 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___ | рублей | | |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___ | рублей | | |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 5,171512 | 9,712193 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___ | рублей | | |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___ | рублей | | |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | 2014 год, 2015 год | Х |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | 30.03.2016 | Х |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | 22.04.2016 – государству, с 28.01.2016 по 15.12.2016 – остальным акционерам | Х |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 337,27 | 431,14 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | | |

8. Среднесписочная численность работающих (человек): **728,** прошлый год – **735**
9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: **сахар – 78,2%**
10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: **29 марта 2017 года**
13. Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения: **при выдвижении кандидатур в Наблюдательный совет и ревизионную комиссию, при разработке внутренних документов Общества**
14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет: **sugar.by**

По мнению аудиторской организации ООО «ФБК-Бел», бухгалтерская отчетность ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат» на 31 декабря 2016 года, а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат» за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

Руководитель — Н. П. Прудник
Главный бухгалтер — С. А. Касабуцкая

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

На 31 марта 2017 года

| | |
|---|---|
| **Организация** | **УП «Страховой брокер «Страховая экспертиза плюс»** |
| **Учетный номер плательщика** | 806000628 |
| **Вид экономической деятельности** | деятельность страховых агентов и брокеров |
| **Организационно-правовая форма** | Частное предприятие |
| **Орган управления** | Юридическое лицо без ведомственной подчиненности |
| **Единица измерения** | тыс. руб. |
| **Адрес** | г. Минск, ул. Лещинского, 14, оф. 8 |

| Активы | Код строки | На 31 марта 2017 года | На 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 48 | 52 |
| Нематериальные активы | 120 | 2 | 3 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **50** | **55** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Расходы будущих периодов | 230 | 10 | 10 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 13 | 15 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 87 | 77 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **110** | **102** |
| **БАЛАНС** | **300** | **160** | **157** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код строки** | **На 31 марта 2017 года** | **На 31 декабря 2016 года** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 33 | 33 |
| Добавочный капитал | 450 | 2 | 2 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 5 | 5 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | (3) | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **37** | **40** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 29 | 30 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **29** | **30** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 69 | 62 |
| в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 23 | 19 |
| по налогам и сборам | 633 | - | 1 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 1 | 1 |
| по оплате труда | 635 | 2 | 3 |
| по лизинговым платежам | 636 | 18 | 19 |
| прочим кредиторам | 638 | 25 | 19 |
| Доходы будущих периодов | 650 | 25 | 25 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **94** | **87** |
| **БАЛАНС** | **700** | **160** | **157** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

за январь – март 2017 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь – март 2017 года | За январь – март 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 34 | 48 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (33) | (33) |
| Валовая прибыль | 030 | 1 | 15 |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 1 | 15 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 1 | 1 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (1) | (1) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 1 | 15 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | - | 1 |
| В том числе: | | | |
| проценты к получению | 103 | - | 1 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 1 | - |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 1 | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (5) | - |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (2) | - |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (3) | - |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | (4) | 1 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | (3) | 16 |
| Налог на прибыль | 160 | - | (3) |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | (3) | 13 |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | (3) | 13 |

Руководитель — А.А. Василенко

Главный бухгалтер — В.П. Кухновец

26 апреля 2017 г.

### АУДИТОР – ИНДИВИДУАЛЬНЫЙ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬ КОВЕЛЬ СВЕТЛАНА ВЛАДИМИРОВНА

Квалификационный аттестат аудитора №0001281
выдан Министерством финансов Республики Беларусь 15.11.2005 г.
220114, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Филимонова, д. 39, кв.70
УНП 191582420
р/с 3013109887006 в ОАО «БАНК БЕЛВЭБ», код 226
тел: 8-029-6553306

### АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ по бухгалтерской отчетности Частное унитарное предприятие «Страховой брокер «Страховая экспертиза плюс» за период с 01.01.2016 г. по 31.12.2016 г.

Исх. №4
«26» апреля 2017 г. г. Минск

Исполняющему обязанности директора Частного унитарного предприятия «Страховой брокер «Страховая экспертиза плюс» Василенко Алексею Алексеевичу, главному бухгалтеру Частного унитарного предприятия «Страховой брокер «Страховая экспертиза плюс» Кухновец Валентине Петровне

**Реквизиты аудируемого лица: Частное унитарное предприятие «Страховой брокер «Страховая экспертиза плюс»**
**Местонахождение:** г. Минск, ул. Лещинского, дом 14, офис 8, Республика Беларусь
**Сведения о государственной регистрации:** В Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь зарегистрировано 08.10.2014 г. за №806000628. **УНП 806 000 628.**

**Аудитор – индивидуальный предприниматель Ковель Светлана Владимировна**
**Местонахождение:** ул. Филимонова, д. 39, кв. 70, 220114, г. Минск, Республика Беларусь.
**Сведения о государственной регистрации:** В Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь зарегистрировано 04.04.2011 г. за №191582420. **УНП 191 582 420.**

Я провела аудит прилагаемой бухгалтерской отчетности Частного унитарного предприятия «Страховой брокер «Страховая экспертиза плюс», состоящей из:
бухгалтерского баланса на 31.12.2016;
отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату;
примечаний к бухгалтерской отчетности.

**Обязанности руководства аудируемого лица по подготовке бухгалтерской отчетности**
Руководство Частного унитарного предприятия «Страховой брокер «Страховая экспертиза плюс» несет ответственность за подготовку и представление бухгалтерской отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности и организацию системы внутреннего контроля, необходимой для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие недобросовестных действий или ошибок.

**Обязанности аудитора-индивидуального предпринимателя**
Я несу ответственность за выраженное мною аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.
Я провела аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года №56-З «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, которые обязывают меня соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской отчетности.
В ходе аудита мною были выполнены аудиторские процедуры, направленные на получение аудиторских доказательств, подтверждающих значения показателей бухгалтерской отчетности Частного унитарного предприятия «Страховой брокер «Страховая экспертиза плюс», а также другую раскрытую в ней информацию. Выбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской отчетности мною рассматривалась система внутреннего контроля Частного унитарного предприятия «Страховой брокер «Страховая экспертиза плюс», необходимая для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.
Аудит также включал оценку применяемой учетной политики, обоснованности учетных оценок и общего содержания бухгалтерской отчетности Частного унитарного предприятия «Страховой брокер «Страховая экспертиза плюс».
Полагаю, что в ходе аудита мною были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

**Аудиторское мнение**
По моему мнению, бухгалтерская отчетность Частного унитарного предприятия «Страховой брокер «Страховая экспертиза плюс», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение Частного унитарного предприятия «Страховой брокер «Страховая экспертиза плюс» на 31 декабря 2016 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2016 г., при этом совершенные Частным унитарным предприятем «Страховой брокер «Страховая экспертиза плюс» финансовые (хозяйственные) операции во всех существенных отношениях соответствуют законодательству.

**Аудитор-индивидуальный предприниматель** **С.В. Ковель**

# ИЗВЕЩЕНИЕ

**о реализации недвижимого имущества**

**ОАО «Барановичидрев»**

**Торги состояться 12 мая 2017 года, в 14.00 по адресу:**

**Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.**

Председатель ликвидационной комиссии ОАО «Барановичидрев» Мищук А.М. проводит торги в форме аукциона по реализации объектов недвижимости:

Конт. тел.:

8 029 6332490 vel.; (029) 8248026 МТС; факс (0163) 455124

E-mail: mischuk_am@mail.ru

---

**ПРЕДМЕТЫ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ:**

**ЛОТ №5 – комплекс зданий и сооружений объединенных**

**в один лот. 4-е повторные торги. Цена снижена на 50%**

**от цены установленной независимым оценщиком.**

1. Объект недвижимости, в г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/10, капитальное строение, с инв. №110/С-112752 площадью 540,2 кв. м, здание специализированное для ремонта и техобслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание гаража и склада с пристроенными административно-бытовыми помещениями, расположенное на земельном участке с кадастровым №141000000003003526, площадью 0,7719 га, расположенного по адресу: г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/11.

СТОИМОСТЬ: 18 500 рублей, без НДС.

2. Объект недвижимости, в г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/11, капитальное строение, с инв. №110/С-112747 площадью 692,5 кв. м, здание многофункциональное, наименование АБК №3, расположенное на земельном участке с кадастровым №141000000003003526, площадью 0,7719 га, расположенного по адресу: г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/11.

СТОИМОСТЬ: 35 200 рублей, без НДС.

3. Объект недвижимости, в г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/12, капитальное строение, с инв. №110/С-112744 площадью 249,6 кв. м, здание специализированное для ремонта и техобслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание гаража, расположенное на земельном участке с кадастровым №141000000003003526, площадью 0,7719 га, расположенного по адресу: г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/11.

СТОИМОСТЬ: 8 100 рублей, без НДС.

4. Объект недвижимости, в г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/9, капитальное строение, с инв. №110/С-112456 площадью 1026,6 кв. м, здание неустановленного назначения, наименование: центральный склад – арочный, расположенное на земельном участке с кадастровым №141000000003003526, площадью 0,7719 га, расположенного по адресу: г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/11.

СТОИМОСТЬ: 30 700 рублей, без НДС.

**ОБЩАЯ СТОИМОСТЬ ЛОТА №5 – 92 500 рублей, без НДС.**

**Комплекс зданий и сооружений, объединенных в ЛОТ №6.**

**2-е повторные торги. Цена снижена на 50%**

**от цены установленной независимым оценщиком.**

1. Объект недвижимости, в г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/22, капитальное строение,с инв. №110/С-112459 площадью 2 079,9 кв. м, здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – здание сушильного цеха, расположенное на земельном участке с кадастровым №141000000003003528, площадью 0,4072 га, расположенного по адресу: г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/22.

СТОИМОСТЬ: 64 000 рублей, без НДС.

2. Объект недвижимости, в г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/27, капитальное строение, с инв. №110/С-113178 площадью 1 464,4 кв. м, здание неустановленного назначения – кирпичное, расположенное на земельном участке с кадастровым №141000000003003539, площадью 0,6101 га, расположенного по адресу: г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/26.

Здание бывшей котельной с обременением оборудованием, подлежащего демонтажу.

СТОИМОСТЬ: 43 750 рублей, без НДС.

**ОБЩАЯ СТОИМОСТЬ ЛОТА №6 – 107 750 рублей, без НДС.**

Победитель торгов обязан оплатить предмет торгов в полном объеме в рублях РБ в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения аукционных торгов.

Составной частью к лотам №5 и №6 является площадь асфальтного покрытия, забор, ворота, оплачиваемая победителем (участником) торгов по отдельному договору.

Сумма задатка: 10% от начальной цены лота №5 и лота №6 в рублях РБ.

Получатель платежа: ОАО «Барановичидрев»,УНП 200299909; р/с 3012122616138 в ф-ле ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Барановичи.

Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.

Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению.

Заявления на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, по ЛОТАМ №6 и №5 в срок до 14.00 05.05.2017 года организатору торгов, председателю ликвидационной комиссии Мищуку А.М. по адресу:

**225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, ОАО «Барановичидрев».**

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистраций.

Более подробно с условиями аукциона можно ознакомиться на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 27.04.2017 года.

Председатель ликвидационной комиссии
ОАО «Барановичидрев» А.М. МИЩУК

---

■ У цэнтры ўвагі

# Чаму сціпласць — не лепшая якасць вучонага?

**«У навукі — асаблівая роля і асаблівае месца. Вучоныя — гэта эліта грамадства, але мы павінны адпавядаць гэтаму званню ў поўнай ступені», — такую думку выказаў старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук, акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ падчас круглага стала «Дасягненні беларускай навукі — грамадству».**

— Перад намі няпростая місія — быць заўсёды ў авангардзе, генерыраваць ідэі, рашэнні і распрацоўкі. Сёння мы маем зусім новую Акадэмію навук, — пакрэсліў Уладзімір Гусакоў. — У нас створаны шэраг вытворчасцяў, вытворчых падраздзяленняў і цэнтраў — усяго каля 40. Акадэмія навук выбудоўваецца як навукова-вытворчая карпарацыя, якая аб'ядноўвае ўвесь ланцужок: ад фундаментальнай навукі, уключаючы прыкладныя даследаванні і распрацоўкі, эксперыментальныя і доследныя ўзоры, да стварэння вытворчасці. Акадэмія ўзяла на сябе функцыю навуковага абслугоўвання цэлых галін: атамнай, медыцынскай, біятэхналагічнай і іншых. Выстава ТІВО-2017 яшчэ раз даказала, што расслабляцца нам нельга ні на хвіліну. Спыненне ў развіцці азначае крах.

На выставе ТІВО-2017 Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі НАН Беларусі прадставіў эксперыментальны ўзор офіснага суперкамп'ютара «СКІФ-ГЕА». Дарэчы, крыху больш як дзесяць гадоў таму створаны ў рамках Саюзнай праграмы суперкамп'ютар «СКІФ-1000» увайшоў у сотню самых магутных суперкамп'ютарных установак свету (заняў 98-ю пазіцыю ў ТОП-500). Офісны варыянт «СКІФ-ГЕА» па памерах меншы за свайго папярэдніка ў 100 разоў, але ўдвая пераўзыходзіць яго па магутнасці. Ён можа выконваць 100 мільёнаў аперацый у секунду. Суперкамп'ютар робіць складаныя разлікі вельмі аператыўна: па асобных задачах — за 7—8 хвілін замест ранейшых 46 гадзін.

— Я лічу, што сёння мы маем такі патэнцыял, што нам усё пад сілу, — канстатуе Уладзімір Гусакоў. — Гэта проста фантастыка, што за няпоўныя 20 гадоў зрабілі нашы вучоныя-гуманітарыі. На іх рахунку — найсур'ёзнейшыя даследаванні па асновах беларускай дзяржаўнасці, у галіне беларускай мовы і літаратуры, гісторыі і археалогіі. Але чаму пра нашы дасягненні так мала ведаюць у свеце? Наша бяда ў тым, што мы не ўмеем сябе пазіцыянаваць. А мы павінны змагацца за сваё месца пад сонцам і нікому не саступаць навуковую прастору. Сціпласць у навуцы зусім не да месца. Наадварот, тут патрабуюцца актыўнасць і нават агрэсіўнасць.

Падчас дыскусіі прагучала мноства слушных думак і прапаноў. Напрыклад, уключаць прамысловыя прадпрыемствы ў кола выканаўцаў навукова-тэхнічных праграм, а на навукоўцаў ускласці ролю па навукова-тэхнічным суправаджэнні выпуску новай прадукцыі.



— Але без навукова-даследчых інстытутаў практычна ва ўсіх міністэрствах і канструктарскіх бюро на прадпрыемствах нам усё роўна не абысціся, — лічыць **акадэмік-сакратар Аддзялення фізікі, матэматыкі і інфарматыкі НАН Беларусі, акадэмік Валянцін АРЛОВІЧ.** — Мы ўсе бачым, што тыя прадпрыемствы, дзе з савецкіх часоў захаваліся моцныя канструктарскія бюро, трывала стаяць на нагах і развіваюцца.

На думку **старшыні Навуковага савета Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў, акадэміка Сяргея ГАПОНЕНКІ,** навука ў нашай краіне адарваная ад вытворчасці:

— Кандыдаты і дактары навук, што працуюць на прамысловых прадпрыемствах, не атрымліваюць надбавак за свае навуковыя ступені.Такія даплаты прадугледжаны толькі ў навуковых арганізацыях, але не на вытворчасці. Я асабіста падрыхтаваў 10 кандыдатаў навук, з іх трое выкладаюць у ВНУ, трое — працуюць у лабараторыях і яшчэ чацвёра зараз знаходзяцца за мяжой. Ніхто ў прамысловасці не працуе. Наша вытворчасць не адчувае патрэбы ў кандыдатах навук? Дык для каго мы іх рыхтуем? — задаў зусім не рытарычнае пытанне Сяргей Гапоненка. — Ва ўсім свеце асноўным спажыўцом аспірантуры з'яўляюцца вытворчыя карпарацыі, а не ВНУ. Philips, Fiat, LG — вось дзе рэалізоўваюцца спецыялісты з навуковымі ступенямі. Прычым карпарацыі ўкладваюць у навуку вельмі сур'ёзныя сродкі. Я лічу, што навука павінна канцэнтравацца ў фірмах, але, канешне, не за кошт ліквідацыі акадэмічнай навукі. А мы павінны ім дапамагаць.

Ці можа вучоны прадаць тое, што ён вынайшаў? Многія ў гэтым сур'ёзна сумняваюцца.

— Я не разумею, чаму вучоны павінен адказваць за аб'ёмы продажаў? Як ён увогуле можа прагназаваць збыт сваёй прадукцыі? Няўжо Майкл Фарадэй мог прадбачыць, якое развіццё атрымае далей электратэхніка? Ці, можа, Аляксандр Папоў адкрыў сваю фірму? Або трэба вучоных вучыць бізнесу, або лепш зводзіць навукоўцаў і бізнесменаў, — лічыць Сяргей Гапоненка. — У нас забюракратызаваныя многія навуковыя рашэнні і навуковая адказнасць. Жорсткае патрабаванне вярнуць сродкі ў бюджэт, нават калі штосьці не атрымалася, прыводзіць да таго, што навукоўцы баяцца брацца за новыя распрацоўкі. Пэўная частка сродкаў павінна накіроўвацца на звышрызыкоўныя праекты, дзе немагчыма гарантаваць стапрацэнтны поспех.

Тэзіс, што навукоўцам трэба плаціць за вынік, таксама спрацоўвае не ва ўсіх выпадках. Калі размова ідзе пра вучоных з салідным стажам работы, то з ім ніхто не спрачаецца. Але прымяняць гэты тэзіс да моладзі, якая робіць толькі першыя крокі ў навуцы, праблематычна. Увогуле сітуацыю, калі сярэдні заробак у навуцы толькі нязначна перавышае сярэдні заробак у сельскай гаспадарцы, і пры гэтым ён адстае ад заробкаў у прамысловасці, нельга назваць нармальнай...

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

# ІНФАРМАЦЫЯ АБ РЭСПУБЛІКАНСКІМ КОНКУРСЕ

## для прызначэння стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным на 2018 год

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11.08.2005 №367 «Аб удасканаленні стымулявання творчай працы маладых вучоных» *(у рэдакцыі Указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 04.04.2006 №199, ад 07.05.2009 №239, ад 28.01.2010 №56, ад 11.08.2011 №362, ад 10.04.2014 №158, ад 16.12.2014 №589, ад 25.05.2015 №214)* заснаваны **100 стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным,** якія працуюць у арганізацыях, што выконваюць навуковыя даследаванні і распрацоўкі ў галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, сацыяльных і гуманітарных навук (далей — стыпендыі). Стыпендыі прызначаюцца тэрмінам на адзін каляндарны год па выніках штогадовага адкрытага рэспубліканскага конкурсу. Памер стыпендыі вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на падставе прапаноў спецыяльна створанай Міжведамаснай камісіі.

Для ўдзелу ў конкурсе вылучаюцца кандыдатуры дасягнуўшых найлепшых вынікаў у навуковай, навукова-тэхнічнай, інавацыйнай дзейнасці **дактароў навук ва ўзросце да 45 гадоў, кандыдатаў навук — да 35 гадоў, вучоных без ступені — да 30 гадоў** на 1 студзеня года, у якім ажыццяўляецца вылучэнне.

Вылучэнне кандыдатур ажыццяўляецца арганізацыяй па асноўным месцы працы таленавітага маладога вучонага на сходзе навуковых работнікаў або навукова-тэхнічным (вучоным) савеце на падставе рэкамендацыі калектыву работнікаў структурнага падраздзялення, дзе ён працуе.

Арганізацыі, якія рэкамендуюць кандыдатуры для прызначэння стыпендый, прадстаўляюць па кожнай з іх хадайніцтва з дадаткам дакументаў, вызначаных Палажэннем аб парадку правядзення штогадовага адкрытага рэспубліканскага конкурсу для прызначэння стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11.08.2005 №367).

Поўная інфармацыя аб парадку правядзення конкурсу, крытэрыях, вызначаных для дасягненняў таленавітых маладых вучоных, пераліку дакументаў, што падаюцца, размешчана на сайце Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь — http://gknt.gov.by.

Дакументы на конкурс для прызначэння стыпендый на 2018 год прадстаўляюцца **да 1 ліпеня 2017 года** ў:

Нацыянальную акадэмію навук Беларусі — па кандыдатурах, рэкамендаваных арганізацыямі акадэміі, на адрас: 220072, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 66, Прэзідыум Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Тэлефоны для даведак: (017) 284-24-56, 284-28-26;

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь — па кандыдатурах, рэкамендаваных установамі вышэйшай адукацыі, на адрас: 220010, г. Мінск, вул. Савецкая, 9, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Тэлефоны для даведак: (017) 200-52-01;

Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь — па кандыдатурах, рэкамендаваных іншымі арганізацыямі, якія выконваюць навуковыя даследаванні і распрацоўкі, на адрас: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь. Тэлефоны для даведак: (017) 284-07-68, 284-19-79.

**У выпадку парушэння тэрміну і формы прадстаўлення названых дакументаў ці прадстаўлення іх не ў поўным аб'ёме хадайніцтвы арганізацый, якія рэкамендуюць кандыдатуры для прызначэння стыпендый, да разгляду не прымаюцца!**

**Стыпендыі не назначаюцца** маладым вучоным, якім:

у папярэднія пяць гадоў, уключаючы год, у якім ажыццяўляецца вылучэнне для ўдзелу ў конкурсе, прызначаліся стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным;

на год прызначэння стыпендыі прадастаўляюцца гранты ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13.09.2013 №425 «Аб грантах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у навуцы, адукацыі, ахове здароўя, культуры» *(у рэдакцыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16.12.2014 №589)* (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 16.09.2013, 1/14521);

на працягу трох гадоў, якія папярэднічалі году прызначэння стыпендыі, прызначаліся іншыя стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, за выключэннем стыпендый і грантаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, таленавітай моладзі.

# «Датэрміновага вызвалення тут не бывае»

## Дзе лечаць злачынцаў, прызнаных судом псіхічна хворымі?



**Жонка два гады труціла мужа. У прамым сэнсе: падсыпала атруту яму ў ежу. Мужчыну станавілася ўсё горш, але ён цярпеў і прасіў жонку перастаць так рабіць. Тая толькі аджартоўвалася. У адзін дзень ён не вытрымаў: нанёс жанчыне 14 смяротных нажавых раненняў. Хацеў забіць і дачку, што была з ёй у змове, але тая паспела збегчы. Нягледзячы на цяжар злачынства, у турму мужчыну не пасадзілі. Адправілі на прымусовае лячэнне. «Насамрэч ніхто яго не труціў. У мужчыны развілася трызненне. Я расказаў гісторыю з яго слоў, каб вы разумелі, у якім стане знаходзіцца псіхічна нездаровы чалавек, калі здзяйсняе правапарушэнне», — з самага пачатку ашаламіў намеснік дырэктара па медыцынскай частцы РНПЦ псіхічнага здароўя Сяргей ОСІПЧЫК. У Навінках для такіх правапарушальнікаў адведзена некалькі аддзяленняў. Як лечаць злодзеяў і забойцаў, якія судовай экспертызай прызнаны бессвядомымі? І што адбываецца з імі пасля?**



Фота Надзеі БУЖАН.

## БАЛЬНІЦА ЎЗМОЦНЕНАГА РЭЖЫМУ

Правапарушальнікаў, якіх прызналі псіхічна нездаровымі, трымаюць у асобным корпусе. Парадак забяспечваюць аўчаркі за агароджай, краты на вокнах і два перыметры аховы — вакол корпуса і на ўваходзе. Плюс відэаназіранне. У аддзяленні міліцыянераў не пускаюць: там ужо дзяжураць санітары і медыцынскія сёстры. Праз кожныя паўтара метра ў калідорах знаходзяцца трывожныя кнопкі, таму ў выпадку форс-мажору міліцэйскую брыгаду могуць хутка выклікаць.

— Ёсць чатыры віды прымусовых мер бяспекі і лячэння, — уводзіць нас у курс справы Сяргей Осіпчык. — Строгі рэжым (самы цяжкі, у бальніцы ў Гайцюнішках), узмоцнены (у нас), звычайны (у псіхіятрычных стацыянарах, якія ёсць у кожнай вобласці) і амбулаторны (чалавек абавязаны з'яўляцца ў дыспансер па месцы жыхарства). Які з іх назначыць чалавеку, вырашае суд. Тэрмін залежыць ад ступені цяжару ўчынку і сур'ёзнасці псіхічнага расстройства. Ёсць тыя, хто і 15 гадоў у нас лечыцца.

Цяпер у Навінках на ўзмоцненым наглядзе знаходзяцца 140 правапарушальнікаў (100 мужчын і 40 жанчын) і прыкладна столькі ж на звычайным. Раз на паўгода камісія ацэньвае стан псіхічнага здароўя пацыента і або рэкамендуе суду перагледзець рэжым, або пакідае чалавека на цяперашнім.

— Лячэнне адбываецца, як у звычайным псіхіятрычным стацыянары. Мэта — забяспечыць адэкватныя паводзіны. Прыбраць трызненні, галюцынацыі. Узрушаны стан — гэта дыскамфорт перш за ўсё для самога хворага, — тлумачыць намеснік дырэктара.

## «ДЗІРАВЫ» ПУШКІН І ПАЧУЦЦЁ ВІНЫ

Жыццё ў аддзяленнях — па раскладзе. Сняданак, працэдуры, перакур... Два разы на тыдзень дазволены сустрэчы з роднымі і прыём перадач. Часцей за ўсё дасылаюць прысмакі — цукеркі, печыва — і цыгарэты. Двойчы на тыдзень у аддзяленне прыходзіць цырульнік (пры РНПЦ ёсць цэлы штат цырульнікаў з пяці работнікаў).

На калідоры стаіць пах фарбы: у некаторых пакоях ідзе рамонт. У палатах, якія зачыняюцца на груваcткі металічны замок, жыве па 4—6 чалавек.

— Па адным не паложана, — тлумачыць **загадчык 34-га псіхіятрычнага аддзялення для прымусовага лячэння з узмоцненым наглядам Уладзімір ВАСІЛЕЎСКІ**. — Мінімум па двое. Ну вы ўявіце: чалавек нездаровы, а яго аднаго запіраюць. І калі яму раптам дрэнна стане, павінен жа нехта ўрача паклікаць.

**Суды разглядаюць справу без пацыентаў: яны па сваім стане не могуць абараняць сябе на пасяджэннях. Таму некаторыя не разумеюць спачатку, куды іх змясцілі і за што.**

Заходзім у адну з мужчынскіх палат. Як той казаў, бальнічная чысціня. На прыложкавых століках — кнігі і абразкі, у некаторых — шахматныя дошкі. На падаконніку адзінока стаіць радыёпрыёмнік.

— Гэта журналісты, — прадстаўляюць нас. — Не хвалюйцеся, твары здымаць не будуць.

— З газеты? А вы ведаеце, што мяне незаконна сюды кінулі? Я не вінаваты, — ажыўляецца адзін з пацыентаў.

Мы пасля пагарталі яго справу. Іван Пятровіч раней працаваў інжынерам у раённай бальніцы. Пасля таго як з ім не працягнулі кантракт, заваліў пракуратуру і чыноўнікаў скаргамі на галоўнага ўрача, якога абвінавачваў у карупцыі і падрыхтоўцы да забойства. Інфармацыя ў даносах не пацвердзілася. Спачатку мужчыну паклалі ў Магілёўскую абласную бальніцу, але праз буйства перавялі ў Навінкі.

— У многіх нашых пацыентаў адсутнічае самакрытыка. Яны не ацэньваюць свае ўчынкі адэкватна, — тлумачыць Уладзімір Васілеўскі.

Сяргей Осіпчык дадае, што суды разглядаюць справу без пацыентаў: яны па сваім стане не могуць абараняць сябе на пасяджэннях. Таму некаторыя не разумеюць спачатку, куды іх змясцілі і за што.

Вольны час асуджаныя бавяць за маляваннем і гульнёй у шашкі. Ці чытаюць: у кожным аддзяленні ёсць свая міні-бібліятэка.

— Кнігі, якія трапляюць сюды, праходзяць нейкую цэнзуру? — цікавімся.

— Так — цэнзуру на наяўнасць колючых прадметаў, — з усмешкай адказвае персанал.

У бібліятэчнай калекцыі — царкоўная літаратура, дэтэктывы, класіка. «У нас тут поўны збор твораў Драйзера, Чэхава, Гогаля, — расказваюць у 38-м аддзяленні. — Больш за ўсё бяруць Чэхава і Пушкіна. Апошні ўвогуле да дзірак зачытаны. Кажуць жа, што Пушкін лечыць. Дзецям з парушэннямі сну яго чытаць рэкамендуюць.

Па тэлевізары — ён ёсць у агульным пакоі — хворыя звычайна глядзяць навіны. Але часам дазваляецца што-небудзь з забаўляльных праграм. У жаночым аддзяленні прызнаюцца: пацыенткі вельмі любяць расійскія серыялы пра ўрачоў.

Праца з жанчынамі, трэба сказаць, мае свае асаблівасці. **Загадчык 38-га псіхіятрычнага аддзялення для прымусовага лячэння з узмоцненым наглядам Мікалай МЯЛЕШКА** расказвае, што ў маці, якія забілі сваіх дзяцей, будучы бессвядомымі, пасля ўзнікае пачуццё віны і думкі скончыць жыццё самагубствам. Урачы мусяць пільна сачыць за іх станам, каб не дапусціць гэтага.

## ПРЫКІНУЦЦА БЕССВЯДОМЫМ НЕМАГЧЫМА

Намеснікам дырэктара ў РНПЦ псіхічнага здароўя Сяргей Осіпчык працуе з 2013 года. За гэты час многага наглядзеўся. Успамінае адзін з выпадкаў, які яго шакіраваў:

— Жанчына пазнаёмілася з мужчынам, прыйшлі да яе дадому, выпілі. Яна ўдарыла яго нажом і адцягнула ў пад'езд на пляцоўку першага паверха. А сама жыла на другім. Міліцыя пачала расследаваць гэту справу, але забойцу не знайшла. Праз год тая ж жанчына выклікае хуткую дапамогу і кажа, што яе знаёмы ўдарыўся галавой і ляжыць у кватэры. Прыехаў урач. Бачыць — на падлозе мужчына, чвэрць чэрапа адсутнічае. А потым заўважае на сцяне кавалачкі мозга. «А гэта што ў вас?» — пытаецца ў жанчыны. «Ды нічога», — кажа яна і пачынае выціраць мозг анучай. Аказалася, яна таго мужчыну мясарубкай забіла, каля 20 удараў нанесла...



**«Некаторым здаецца, што калі прызнаюць, што ў момант правапарушэння ты быў у стане бессвядомасці, то пазбегнеш пакарання. Але ж у любым выпадку на прымусовым лячэнні будзеш адбываць прыкладна такі ж тэрмін, які чакаў бы па крымінальным кодэксе».**

Псіхічнае расстройства ў вострай стадыі не ўзнікае адразу. Яно развіваецца паступова. Чаму ж тады сваякі не заўважаюць, што з іх блізкім чалавекам нешта не так?

— Прывяду прыклад, — тлумачыць Сяргей Осіпчык. — Ішоў ваш добры знаёмы і разбіў вітрыну. Яго пытаюць: навошта гэта зрабіў? Адказвае: я не спецыяльна, мяне штурхнулі. Потым у грамадскім транспарце некага пабіў. Апраўдваецца, што той пасажыр першы ўдарыў. Гэта такія дробязі, якія, калі ацэньваць адзін факт, ні аб чым не кажуць, але, калі праналізаваць ланцужок, ужо відаць, што развіваецца расстройства. Але ж сваякі не спецыялісты. Яны не надаюць гэтаму значэння.

Некаторыя злачынцы падчас судовай экспертызы спрабуюць прыкінуцца хворымі. Але для таго каб гэта ўдалося, кажуць у Навінках, патрэбна сур'ёзная падрыхтоўка: начытацца медыцынскай літаратуры, дэманстраваць расстройства на працягу доўгага часу і пры гэтым не трапіць у пастку. Таму прыкінуцца практычна немагчыма. «Некаторым здаецца, што калі прызнаюць, што ў момант правапарушэння ты быў у стане бессвядомасці, то пазбегнеш пакарання. Але ж у любым выпадку на прымусовым лячэнні будзеш адбываць прыкладна такі ж тэрмін, які чакаў бы па крымінальным кодэксе. У турме нават, пры ўзорных паводзінах, можна трапіць на ўмоўна датэрміновае вызваленне і адседзець менш. Тут такога няма, раней не выйдзеш».

Цікава, што ў Беларусі пры прызначэнні прымусовых мер бяспекі і лячэння чалавека вызваляюць ад крымінальнай адказнасці. У ЗША, для прыкладу, правапарушальнікі не вызваляюцца ад адказнасці: пасля бальніцы ён ідзе адбываць сваё пакаранне ў турме.

— Любы дыягназ рэальна вылечыць? — пытаемся ў Сяргея Осіпчыка.

— Медыцына не можа вылечыць ні адну сур'ёзную хваробу. Нават пнеўманія пакідае пасля сябе наступствы. Так і тут. Наша задача — забяспечыць рэмісію, а яна можа цягнуцца і 25, і 30 гадоў.

У звычайнае жыццё чалавека, які адбыў тэрмін у бальніцы, вяртаюць паступова. Пераводзяць спачатку з узмоцненага на звычайны рэжым, потым на амбулаторны. «Дыягназ «псіхічнае расстройства» не дазваляе абмяжоўваць былога пацыента ў сацыяльным жыцці, — заўважае намеснік дырэктара. — Ён мае права жыць, як усе астатнія. Калі складваецца спрыяльная сітуацыя — чалавек прымае лячэнне, сям'я глядзіць яго — ён добра адаптуецца». Праўда, тыя, хто вяртаецца ў аддзяленне праз паўторнае правапарушэнне, таксама ёсць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
lubneuskaya@zviazda.by

## Наталля БАРДЗІЛОЎСКАЯ:

# «ЦЯЖКА ЗАСТАЦЦА Ў ПАМЯЦІ ГЛЕДАЧА. АЛЕ МАГЧЫМА»



Фота Аляксандра САПАЎЯ.

**Амаль штодзень з тэлеэкрана ў праграмах навін яна нам расказвае пра асноўныя падзеі, што адбыліся ў культурным жыцці краіны. Здаецца, ніводная выстаўка, прэм'ера спектакля, юбілей творцы не застаюцца па-за яе пільнай увагай.**

**Пра адметнасці працы ў галіне культурнай тэлежурналістыкі, прынцыпы выхавання і строгасць да сябе мы сёння гутарым з журналісткай Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі, рэпарцёрам, вядучай Наталляй БАРДЗІЛОЎСКАЙ.**

***— Спадарыня Наталля, вы заўсёды марылі працаваць на тэлебачанні?***

— Напэўна, я трапіла сюды невыпадкова. Мой бацька працаваў журналістам, вёў радыёпраграму, пісаў у газету. Калі ён працаваў на радыё, я гуляла ў прафесію. Былі спецыяльныя машынкі, якія запісвалі гук, я рыхтавала нейкія «праграмы», якія мы дома ўсе разам слухалі. Потым захацелася паступаць у Мінск на факультэт журналістыкі. Але бацька не адпусціў, бо лічыў, што вялікі горад (я родам з Магілёва) не прынясе карысці. Ён вырашыў, што я павінна развівацца як музыкант. Таму я скончыла музычную школу, вучылішча і кансерваторыю па класе фартэпіяна. І здавалася б, што ўсё складаецца ў тым кірунку. Але не, на мясцовым тэлебачанні быў конкурс для маладых, у якім я ўдзельнічала, сачыла за тым, як працавалі старэйшыя калегі. Так усё пачалося. Цяжка было, але хацелася, паступова набіралася вопыту. Я веру, што, калі ёсць жаданне, можна горы перавярнуць. Бо журналіст — гэта не толькі адукацыя, гэта лад жыцця.

***— Але ж у працы яшчэ і шмат выпрабаванняў...***

— Журналіст — гэта той чалавек, які хоча працаваць, мець стасункі з людзьмі. Я прайшла ступень навучання ў Магілёве, потым у Мінску. Калі прыязджаеш у вялікі калектыў, у вялікі горад, заўсёды нешта трэба даказваць. Цяпер усё пройдзена, гэтыя вяршыні ўзятыя, і я разумею, што на сваім месцы працую. Задавальненне ёсць, ёсць і цяжкасці, але яны прыемныя. Наша работа шчаслівая тым, што мы маем магчымасць сустракацца з рознымі людзьмі, адчыняць розныя дзверы, бачыць тое, што звычайны чалавек не пабачыць. Вядома, расказваць пра гэта.

***— Чаму менавіта культуру абралі ў якасці сваёй асноўнай тэмы?***

— Напэўна, кожны журналіст мае сваю скіраванасць. Мне сфера палітыкі, эканомікі не такая цікавая, і, можа, яна ў мяне не атрымалася б зусім. Я з лічбамі ніколі не сябравала, сумна расказваць пра практычныя, сухія факты. Мне важны, цікавы свет культуры, мастацтва, духоўнасці, рэлігіі. Люблю апавядаць пра чалавека. Магчыма, гэта звязана з тым, што я займалася музыкай. Думаецца, правільна, што кожны журналіст прызначаны для сваёй тэмы. Мы не з кожным чалавекам можам сябраваць, не кожнага пакахаем. Таму і тэма для працы выбіраецца паводле памкненняў.

***— Столькі гадоў расказваючы пра культуру, магчыма, вы самі ўжо сталі сваім чалавекам сярод мастакоў, акцёраў, спевакоў?***

— Не магу сказаць, што свая для ўсіх. Нехта прывячае, нехта — не. Але часта, калі я прыязджаю ці тэлефаную, ёсць момант пазнавання. Гэта проста вопыт і ўзрост. Калі прадстаўляешся, не трэба доўга тлумачыць, хто ты. Ёсць многа сяброў сярод артыстаў, мастакоў, усе яны вельмі цікавыя людзі, шчырыя, безабаронныя. Магчыма, не вельмі практычныя ў жыцці. Я заўсёды захапляюся мастакамі. Не кожны зразумее мастака, можа проста ў побыце абразіць. Мне падабаюцца людзі, якія займаюцца сваёй любімай справай, а не проста дзеля прыбытку. Якія трымаюцца і маюць унутраны стрыжань. Гэтаму хочацца ў іх вучыцца.

***— Напэўна, праца ў навінах таксама мае сваю спецыфіку, накладае адбітак на рытм жыцця?***

— Навіны — гэта асобная дзяржава, тут вельмі цікава, гэтая праца прымушае ўвесь час рухацца, змяняцца, трымаць сябе ў форме, нягледзячы на ўласныя звычкі, сямейныя клопаты. Ты не ведаеш, як складзецца дзень, але прыйдзе навіна — і трэба яе рабіць. Гэта самае цікавае.

***— Маеце сакрэт, як заставацца прыгожай на экране, нягледзячы на шалёны тэмп жыцця і працы?***

— Я не лічу, што сёння так і добра выглядаю *(смяецца)*, час ідзе. У маладосці бярэш адным, а ўжо ў больш сталым узросце — іншым. Можа, нейкі давер гледача з'яўляецца. Мне пашанцавала, бо ад пачатку мяне палюбіла камера. Я ў жыцці нават магу быць не такой, але на экране буду выглядаць прыгожа. Не магу пахваліцца тым, што трымаю сябе ў форме, часам даю сабе паслабленні, маю да сябе шмат прэтэнзій. Лянота — наш вораг, і на яе мы спісваем многае. Але ж насамрэч калі хочаш, то знойдзеш час на ўсё. Варта за сабой сачыць, рухацца, правільна харчавацца. Але разумею, што для мяне як для гледача важная харызма, абаяльнасць чалавека. Часам, бывае, бачыш на экране чалавека з неідэальнай знешнасцю, але ён гаворыць цікава, сам з'яўляецца асобай. Думаецца, гэта самае істотнае ў нашай прафесіі.

> **«Мне важны, цікавы свет культуры, мастацтва, духоўнасці, рэлігіі. Люблю апавядаць пра чалавека».**

***— Глядзіце свае эфіры?***

— Так, прагладаю. Важна сачыць за сваёй працай, мовай. Бо мы ж не ідэальныя. Калі глядзіш эфір, то разумееш, што можна было б лепш зрабіць, але ўжо ўсё зроблена. Унутраны рэдактар павінен быць заўсёды, супакойвацца нельга. Не для таго, каб любавацца сабой, а каб бачыць свае недахопы і выпраўляць іх, пазбягаць у будучыні. Гэта вучыць. Людзі вучаць, калегі. Раней я абражалася, калі нехта рабіў мне заўвагі, крытыкаваў. А потым я недзе прачытала і пагадзілася з тым, што людзям, якія нас крытыкуюць, не любіць нават, мы вельмі абавязаныя. Дзякуючы ім мы расцём: нас «чапляюць» заўвагі, і мы змяняемся. Калі ж будуць казаць толькі, якія мы харошыя і прыгожыя, то ніякага развіцця не будзе, будзе толькі расслабленне. У выхаванні таксама працуе гэтае правіла. Нельга занадта хваліць дзіця, варта трымацца строгасці, кансерватыўнасці.

***— Вы сваю дачку таксама ў строгасці выхоўваеце?***

— Здараецца, «наязджаю», як зараз кажуць. Яна сціплая дзяўчынка, спакойная. Нельга, магчыма, з ёй так, але хочацца, каб яна вырасла правільным чалавекам. Мне вельмі не падабаецца, што сышла павага да старэйшых, што вучань можа крытыкаваць настаўніка, сын — бацьку. Раней такое немагчыма было ўявіць...

***— На вуліцы вас пазнаюць? Магчыма, у крамах?***

— Бывае. З аднаго боку, гэта прыемна, значыць, людзі глядзяць навіны, бачаць маю працу. Гэта ж прафесія такая. Публічнасць нашай работы да многага абавязвае. Тое, што могуць іншыя сабе дазволіць, нам нельга. Трэба сябе заўсёды трымаць у напрузе. На экране ты ўзор і не маеш права яму не адпавядаць у жыцці. Гэта мабілізуе.

***— Для журналістаў, якія працуюць у сферы культуры, складана адвабіцца ад працы і адпачыць. Як вы самі адпачываеце?***

— Мне падабаецца «культурніцкае» кола. Гэта жывыя людзі, захопленыя сваёй справай, якія ў любым узросце могуць быць як дзеці. У гэтым і наша жыццё. Але калі б мяне нехта запрасіў у тэатр ці на выстаўку, я б не пайшла. Гэта ёсць у нас на працы. Напэўна, мы развучыліся атрымліваць асалоду як гледачы, бо адразу ацэньваем. Мы ж ведаем і некаторыя закулісныя рэчы. Таму, на жаль, культурны адпачынак — не для мяне. З кнігай — так. За праглядам фільма. Але некуды ісці — не. Лепш ужо дома, з самой сабой, дачкой, сям'ёй.

> **«Навіны — гэта асобная дзяржава, тут вельмі цікава, гэтая праца прымушае ўвесь час рухацца, змяняцца, трымаць сябе ў форме, нягледзячы на ўласныя звычкі, сямейныя клопаты».**

***— Хочаце, каб дачка таксама стала тэлежурналістам?***

— Самае галоўнае займацца тым, што ты сам выбраў, што сапраўды хочаш рабіць. Мая дачка бачыць, як я працую. Часам нават думаю: як карысна, калі ў дзяцінстве бачыш, як працуюць бацькі. Мы ведаем: адукацыя — гэта адно, а вопыт — іншае. Я б з ёй падзялілася сваімі прафесійнымі здабыткамі.

***— Самі ў каго яшчэ вучыцеся?***

— Ва ўсіх. Я прыглядаюся да таго, што робяць калегі. Журналісты — як «хапуны», мы многае пазычаем, многае спрабуем. Не магу сказаць, што маю пэўнага чалавека як узор, бо баюся расчаравацца і быць падобнай. Важна стаць асобай, бо вельмі цяжка застацца ў памяці гледача. Але можна.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

# Кіно з мінулым

Што: «Каралева бензакалонкі»
Калі і дзе: АНТ, 1 мая ў 11.30



Камедыя 1962 года. Абаяльная маладая палтаўчанка Людміла з дружалюбным прозвішчам Добрыбечар шукае сябе ў жыцці — спрабуе стаць то дыктарам тэлебачання, то сцюардэсай. Чарговая яе вялікая мара — танцы, прычым не дзе-небудзь, а ў балеце на лёдзе. Аднак яна не праходзіць па конкурсе, і ў чаканні наступнага года і новага набору ёй трэба шукаць працу. Уладкоўваецца дзяўчына, можна сказаць, зусім выпадкова, запраўшчыцай на бензакалонку.

Паступова бензакалонка робіцца ўзорным «астраўком культуры» на трасе, а Людміла, здаецца, зусім не супраць змяніць мару, каб адчуваць сябе карыснай і патрэбнай многім людзям.

Што: «Грубая сіла»
Калі і дзе: СТБ, 3 мая ў 1.33



Турэмная драма, знятая ў стылі нуар 70 гадоў таму — між іншым, бацькам знакамітага шансанье Джо Дасэна.

Турма «Вестсайд» ніколі не была гасцінным месцам, а з прыходам новага начальніка капітана Мэнсі ўмовы сталі проста невыноснымі. Капітана ненавідзяць як зняволеныя, так і персанал за празмерна жорсткія метады кіравання — падманам і катаваннямі ён прымушае некаторых падапечных даносіць на сукамернікаў. Апошняй кропляй становіцца адмена магчымасці датэрміновага вызвалення. Пасля гэтага Джо Колінз, асуджаны за крадзеж грошай на аперацыю для хворай на рак жонкі, разам з яшчэ некалькімі зняволенымі адважваецца на ўцёкі, хоць мясцовы доктар сумна прароча і папярэджвае іх: «Ніхто ніколі не збягае». Шраг падзей правакуе масавы крывавы бунт, у выніку якога большасць зняволеных гіне, забіраючы з сабой на той свет і начальніка турмы, так што перамога правапарадку ў дадзеным выпадку аказваецца піравай.

Што: «Пра Віцю, пра Машу і марскую пяхоту»
Калі і дзе: «Беларусь 3», 6 мая ў 12.00 і 7 мая ў 8.45



Дыпломная работа Міхаіла Пташука — прыгодніцкі фільм для ўсёй сям'і.

Сямігадовы Віця жыве з бацькамі ў ваенным гарадку, дзе размешчана часць марской пяхоты, і ў найлепшых сябрах у яго — не аднагодкі, а вайскоўцы, якія дапамагаюць хлопчыку зразумець, што такое гонар, адвага і сапраўдны мужчынскі характар. А перад ад'ездам бацькі адпраўляюць Віцю ў піянерскі лагер, каб той адаптаваўся і ў дзіцячым асяродку. І хоць насельнікі летніка адразу запісалі хлопца ў «малечу», менавіта ён аказаўся самым дарослым па духу, сталым чалавекам у сваім атрадзе і здолеў навучыць іншых, з аднаго боку, вайсковай дысцыпліне, а з другога — спагадлівасці і гатоўнасці прыйсці сябру на дапамогу...

## Панядзелак, 1 мая

### Беларусь 1

**6.45 Камедыя «Дзень выбараў».*****
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20** Клуб рэдактараў.
**10.55, 12.10 Меладрама «Апоўдні на прыстані».*****
**15.15 Меладрама «Усё да найлепшага».***
**19.10, 21.40 Меладрама «Тры дарогі».***
**21.00** Панарама.
**23.30 Камедыя «Дзень выбараў-2».*****

### Беларусь 2

**7.05, 18.35, 22.30** Тэлебарометр.
**7.40** Капейка ў капейку.
**8.15 Фільм для дзяцей «Беласнежка».***
**9.20 Трагікамедыя «Тэрмінал».***



**11.35** «Каханне анлайн». Рэаліці-шоу.
**12.45** Рэпарцёр.
**13.35 Серыял «Шчаслівыя разам-4».*****
**14.40** «Калі мы дома». Скетчкам.***
**15.45** «Універ-шэф».
**16.20** «Вялікая ілюзія на Кіпры».
**16.55** Анімацыйны фільм «Монстры на канікулах».*
**19.15** Суперлато.
**20.10** «Сям'я». Рэаліці-шоу.
**21.15, 22.10** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**22.05** КЕНО.
**22.35** «Вярніце мне прыгажосць». Медыцынскае рэаліці.
**23.35** «Анлайн». Скетчкам.

### Беларусь 3

**7.35, 11.35, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**7.50, 11.50, 14.10, 20.20** «Гэты дзень».
**7.55** «Беларуская кухня». Капытки з мачанкай.
**8.25, 21.10 «Белыя Росы». Камедыя.***
**9.50, 22.35 «Белыя Росы. Вяртанне». Меладрама.***
**11.55** «Выйсце ёсць». Народны артыст Беларусі Аляксандр Яфрэмаў.
**12.20** «Нацыянальны хіт-парад».
**13.15** «Славянскі базар у Віцебску-2002».
**14.15** «Аксана Волкава — Solo». Канцэрт.
**15.25 «Д'Артаньян і тры мушкецёры». Маст. фільм.***
**19.35** «Тэатр у дэталях». Спектакль Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра «Блакітная камея».
**20.25** «На прыродзе з Віталём Гуменным».
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Час кіно».

### Беларусь 5

**8.00** Біятлон. Чэмпіянат свету. Гонка пераследу. Жанчыны.
**8.50** Біятлон. Этап Кубка свету. Кантыялахці. Спрынт. Жанчыны.
**10.15** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — «Шахцёр» (Салігорск).
**12.05** Хакей. Чэмпіянат свету. Славакія — Беларусь.
**14.20** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў памяшканні.
**17.15** Гандбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Беларусь — Венгрыя.
**18.50** Хакей. Еўравыклік. Францыя — Беларусь. (У перапынках — PRO спорт. Навіны.)
**21.10** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**21.55** Час футбола.
**22.40** Змешаныя адзінаборствы. Fight Nights. Global-64.

### АНТ

**7.00, 8.05** «Наша раніца».
**8.00** (з субцітрамі), **9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** Контуры.
**10.00 Камедыя «Арол і рэшка».***
**11.30 Камедыя «Каралева бензакалонкі».**
**13.00** Канцэрт Надзеі Бабкінай.
**14.05 Камедыя «Прыходзьце заўтра...»**
**16.15 Маст. фільм «Верныя сябры».**
**18.10** Кіно ў колеры. Меладрама «Вясна на Зарэчнай вуліцы».*
**19.50, 20.55** Юбілейны канцэрт Льва Лешчанкі ў Дзяржаўным Крамлёўскім Палацы.
**23.00 Маст. фільм «Уік-энд у Берні».*****

### СТБ

**6.00 Камедыя «Суперцешча для няўдачніка».***
**7.35** «Дакументальны праект»: «Анёл безнадзейных».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне».
**10.05** «Залатая калекцыя беларускай песні» ў Салігорску.
**12.50** «Вялікі горад».
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40 Маст. фільм «Няўлоўныя мсціўцы».**
**15.00 Маст. фільм «Новыя прыгоды няўлоўных».**
**16.40 Маст. фільм «Карона Расійскай імперыі, або Зноў няўлоўныя».**
**19.00** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.05 «Сляды апосталаў». Серыял.**
**23.40** «Соль». Спецыяльны выпуск. Канцэрт гурта «Чиж и Ко».
**1.10** «Ваенная тайна».

### МІР

**5.20** М/ф «Прыгоды капітана Урунгеля».
**7.35** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**8.30, 10.15** Фестываль Аўтарадыё «Дыскатэка 80-х».
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**11.50 Маст. фільм «Сардэчна запрашаем, або Пабочным уваход забаронены!»**



**13.15, 16.15 Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры».***
**18.30** «Любімыя акцёры».
**19.20 Серыял «Легенды пра Круга», 1—4-я серыі.***
**22.55 Маст. фільм «Пірамміда».*****
**1.05 Маст. фільм «Вяртанне Максіма».**
**2.50** М/ф «Востраў скарбаў».*
**4.05** М/ф.0

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**8.10 Камедыя «Майскі дождж».***
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 20.00** Весткі.
**11.10** Ток-шоу «Што адбываецца».
**12.15** «Наша справа».
**12.30 Маст. фільм «Не таго поля ягада».***
**16.05** Вялікі юбілейны канцэрт Філіпа Кіркорава.
**18.20** «Аншлаг і Кампанія».
**20.55 Маст. фільм «Французская кулінарыя».***
**0.00 Маст. фільм «Да цешчы на бліны».***

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05** «Іх норавы».0
**6.25** «Цуд тэхнікі».
**7.10, 8.15 Серыял «Час Волкава».*****
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**09.10 Серыял «Мухтар. Новы след».*****
**10.20 Серыял «Ляснік».*****
**12.00** Суд прысяжных.
**12.55, 16.20, 19.20 Серыял «Марскія д'яблы».*****

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.45** «Сябры Дзядулі Марка».
**11.00** Прыгоды «Пляж».
**12.55, 19.20 Серыял «Легенды».**
**14.25 Вестэрн «Бандыткі».**
**15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад»: «Высокая горка», «Чароўны скарб».
**17.15 Серыял «Каўчэг».**
**18.30 Серыял «Агент Картэр».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Эрын Брокавіч».**
**23.15 Серыял «Ведзьмы Усходняга ўзбярэжжа».**

### ВТБ

**6.00** Скетч-шоу «6 кадраў».***
**7.00, 2.30** «Ералаш».
**8.00** М/ф «Егіптус».0
**8.30, 3.00** М/ф «Тры каты».0
**9.00, 3.20** М/ф «Смяшарыкі».0
**9.30, 3.40** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**10.00** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» *
**11.00** Камедыя «Знаёмства з Факерамі».*
**13.10** Камедыя «Знаёмства з Факерамі-2».*
**15.10** Анімацыйны фільм «Як прыручыць дракона».0
**17.00** «Уральскія пельмені». Бацькі і гэтыя.***
**18.40** «Уральскія пельмені». Май-на! ***
**20.40** Драма «Легенда №17».*
**23.15** «Сэрцы за каханне».***
**23.45** «Кіно ў дэталях».***
**0.45** «Турбаміксер».***
**4.00** «Лаві момант».***
**5.00** «Дурні і дарогі».***

### Культура

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** «Прынцэса цырка». Маст. фільм.
**13.00** «Больш, чым каханне». Людміла Касаткіна і Сяргей Коласаў.
**13.45** «Прыгоды мядзведжай сям'і ў лясах Скандынавіі». Дак. фільм.
**15.10** 100 гадоў з дня нараджэння Фёдара Хітрука. «Віні-Пух». «Віні-Пух ідзе ў госці». «Віні-Пух і дзень клопатаў». М/ф.
**15.50, 1.40** «Фёдар Хітрук. Быць усім». Дак. фільм.
**16.45** Гала-канцэрт трэцяга фестывалю дзіцячага танца «Святлана».
**19.05** «Краіна Данелія». Дак. фільм.
**19.55** «Я крочу па Маскве». Маст. фільм.
**21.15** «Алег Табакоў. Абломаў на шляху Штольца». Дак. фільм.
**22.05** «Юбілей ювеліра». Спектакль МХТ імя А.П. Чэхава.
**23.40** «Блізняты». Маст. фільм.
**1.00** «Толькі класіка». Анці Сарпіла і яго «Swing Band».
**2.35** І. Штраус. «Не толькі вальсы».

### Настальгія

**6.00, 0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1963. 2009 год.***
**7.10** Маст. фільм «Штэпсель жэніць Тарапуньку».***
**8.20, 17.25, 21.40, 23.00, 1.05, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.*
**9.00** «Быў час». 2010 год.***
**10.00** Маст. фільм «Мы, ніжэйпадпісаныя».***
**12.20** «КВЗ 87—88». 3-я сустрэча. Каманды НДУ і 1 ЛМІ.*
**14.15** Праграма «Тэма» з У. Лісцьевым: «Таленты і іх паклоннікі». 1993 год.***
**15.00** Маст. фільм «Не бойся, я з табой».***
**17.45** «Быў час» з Аляксандрам Палíткоўскім: «Мае 6 сотак». 2007 год.*
**18.40** Маст. фільм «Бедная Маша».****
**21.00, 3.00** «Мінулы час».*
**22.00** «Народжаны ў СССР».*
**1.30** Тэлеспектакль «Два вероны».***
**4.00** «Колба часу».

### EuroSport 1

**4.00, 13.45** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**5.00, 9.30** Веласпорт. «Тур Рамандыі».
**6.30** Веласпорт. «Тур Ёркшыра».
**7.30, 11.00, 14.30, 16.00, 20.00, 2.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Фінал.
**12.55, 19.00** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй».
**13.00, 1.45** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**0.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**1.00** Футбол. «ФІФА».
**1.30** Watts.

### Кінакамедыя

**0.20** Камедыя «Памятаю — не памятаю».*
**1.45** Меладрама «Мой самы страшны кашмар».***
**3.35** Меладрама «Па той бок».***
**5.30** Камедыя «Успаміны».***
**7.10** Камедыя «Прышэльцы ў Амерыцы».0
**8.50** Камедыя «Аднакласніцы».***
**10.20** Камедыя «Як займацца любоўю па-англійску».****
**12.10** Меладрама «Былыя: найлепшыя сябры!»***
**14.00** Скетчкам «Паміж намі».***
**14.15** Камедыя «Таткі без шкодных звычак».***



**16.00** Камедыя «Ёлкі».*
**17.40** Камедыя «Можаце зваць мяне татам».***
**19.30** Камедыя «Да чорта на рогі».***
**21.05** Камедыя «Правілы жыцця французскага хлопца».***
**22.45** Камедыя «Прышэльцы».*

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.00** «Тайны савецкага кіно».
**10.30** «Службовы раман». Камедыя.
**13.25, 5.35** «Асцярожна, махляры!»
**14.00** «Без падману».
**14.50** «Пераможца». Маст. фільм.***
**16.40** «90-я».
**17.30** «Савецкія зоркі. Пачатак шляху». Дак. фільм.
**18.20** «Неспакойны ўчастак». Серыял.
**19.15, 2.20** «Назад у СССР». Маст. фільм.***
**22.55** «Развітанне».
**23.40** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.25** «Усе ў захапленні ад Мэры». Камедыя.***

### ТБ1000

**6.10** Параноя.
**8.15** Аднакласнікі.
**10.15** Пасейдон.
**12.15** Усмешка Моны Лізы.
**14.30** Пазаземная рэха.
**16.25** Знесеныя ветрам.
**20.30** Шэф Адам Джонс.
**22.30** Блакітная лагуна.
**0.30** Перакладчыца.
**2.55** Выратаванне.
**4.25** Акадэмія вампіраў.

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Руд і Сэм.
**8.20** Анучны саюз.
**10.20** Сын.
**12.10** Саламяны капялюшык.
**14.40** Мама.
**16.40** Няўлоўныя: джэк-пот.
**18.20** Сухадол.
**20.20** Мамы.
**22.20** Асаблівасці нацыянальнага палявання.
**0.20** Каханне напракат.
**2.20** Прывід.
**4.30** Тата.

### National Geographic

**6.00, 13.20** Гульні розуму.*
**6.25, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.45, 14.50** Міжнародны аэрапорт Дубай.*
**8.30, 11.05, 15.35** Ледзяная дарога.*
**9.15, 22.45** Геній.*
**10.20** Эвакуацыя Зямлі.***
**11.50, 16.20, 19.35, 23.50, 3.00** Расследаванні авіякатастроф.*
**12.35, 20.20, 2.15** Навука будучыні.*
**18.45, 21.55** Пачатак.*
**1.20, 4.40** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.*

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.*
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Бітвы за кантэйнеры.*
**11.00** Дзікая кухня.***
**17.00, 22.00, 6.20** Махінатары.*
**18.00, 1.00** Кола: гульня на выжыванне.***
**19.00, 2.00** Ратаўнікі Эверэста.***
**20.00, 3.00** Аляска: сям'я з лесу.***
**4.40** Маланкавыя катастрофы.***

0 — без узроставых абмежаванняў; * — дзецям да 12 гадоў прагляд фільма дазволены ў суправаджэнні бацькоў або педагога; ** — дзецям да 14 гадоў прагляд фільма дазволены ў суправаджэнні бацькоў або педагога; *** — фільм дазволены для паказу гледачам, старэйшым за 16 гадоў; **** — фільм дазволены для паказу гледачам, старэйшым за 18 гадоў; Э18 — эратычны фільм, дазволены для паказу гледачам ад 18 гадоў.

## Аўторак, 2 мая

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.50** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**9.10 Меладрама «Прыгажун і пачвара».***
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Дыверсант. Канец вайны».*****
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».*****
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.30 Серыял «Позняе раскаянне».*****
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.10** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**22.00 Серыял «След».*****
**0.45** Дзень спорту.
**0.55 Серыял «Увага, гаворыць Масква!»*****

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 23.45** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Каханне і іншыя недарэчнасці...»*****
**11.20, 17.00 Серыял «Анжаліка».*****
**12.30, 20.00** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**15.15** Кіслы comment.
**15.20, 23.50** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05 Трылер «Тут нехта ёсць...»*****
**21.30** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. Першы матч.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Запечаны бурак.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 15.20, 20.15** «Гэты дзень».
**8.25 «Д'Артаньян і тры мушкецёры». Маст. фільм, 1-я серыя.***
**9.50** «Майстры і кумiры». Народная артыстка БССР Наталля Гайда.
**10.45** М/ф.0
**11.05, 15.25** «Чыста англійскія забойствы». Дэтэктыў. «Лес душыцеля». 1-я серыя.***
**12.20** «Святло далёкай зоркі». Памяці заслужанага артыста БССР Уладзіміра Кудрэвіча.
**12.45, 20.20** «Грані Перамогі». «Зброя Перамогі». Частка 1-я.
**13.00** «Дзённікі беларускага падполля». Брэст.
**13.25 «Бывай». Маст. фільм.***
**14.55** «СССР — музыка пад забаронай». Гурт «Кіно».
**16.25, 21.05** «Гісторыя ваенных парадаў на Чырвонай плошчы». Фільм першы.*
**17.10, 21.40 «Сямнаццаць імгненняў вясны». Серыял. 1-я і 2-я серыі.***
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00** Мастацкая гімнастыка. Этап Кубка свету. Баку.
**11.00** Хакей. Еўравыклік. Францыя — Беларусь.
**13.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — ФК «Віцебск».
**14.55** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**15.40** Час футбола.
**16.20** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/4 фіналу. Матч у адказ. ПСЖ (Францыя) — «Пік» (Венгрыя).
**17.55** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — «Шахцёр» (Салігорск).
**19.50** PRO спорт. Навіны.
**20.00** Вольная і грэка-рымская барацьба. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Жанчыны. Фіналы.
**22.20** Спорт-кадр.
**22.50** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**23.20** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт. Фінал.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.20** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15** «Сёння вечарам».
**16.20** «Адваротны адлік».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Вялікая».***
**23.00** «Вячэрні Ургант».
**23.35** «На ноч гледзячы».

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Меншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40, 0.15 «Важняк. Гульня навылет». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».
**14.40 «Сляды апосталаў». Серыял.**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**1.50 Маст. фільм «Страх і пажадлівасць».*****

### МІР

**6.00** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30** Добрай раніцы, свет!***
**9.00 Маст. фільм «Сардэчна запрашаем, або Пабочным уваход забаронены!»**
**10.20** «Зроблена ў СССР».
**10.50 Маст. фільм «Самая лепшая бабуля».***
**12.30** «Любімыя акцёры», Ігар Старыгін.
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».*****
**19.20, 4.25 Серыял «Закон і парадак».*****
**22.15 Маст. фільм «Пірамміда».*****
**0.20 Серыял «Спрут».*****
**2.15 Серыял «Гарачы лёд».*****

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.45 Камедыя «У старых рытмах».***
**13.30** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Скліфасоўскі».**
**19.15, 20.40 Серыял «Асабовая справа».**
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**22.00, 23.10 Серыял «Ціхі Дон».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Двайныя стандарты».
**7.10, 8.05 Серыял «Час Волкава».*****
**9.00 Серыял «Мухтар. Новы след».*****
**9.45** «За мяжой».
**10.20 Серыял «Ляснік».*****
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Дарожны патруль».*****
**17.05 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».*****
**19.40 Серыял «Марскія д'яблы».*****
**22.25** «Вынікі дня».
**22.55** «НЗ.by».
**23.15 Серыял «Шэф».*****

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.15** «Сябры дзядулі Марка».
**10.30** «Мой любімы гадавалец».
**11.00 Драма «Эліза».**
**12.50, 19.20 Серыял «Легенды».**
**14.15 Серыял «Палацавыя тайны».**
**16.05, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.10** «Мультпарад»: «Канікулы Баніфацыя», «Лясныя падарожнікі».
**17.00 Серыял «Каўчэг».**
**18.30 Серыял «Агент Картэр».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Трылер «Землетрасенне».**
**23.05 Серыял «Ведзьмы Усходняга ўзбярэжжа».**




## Са жвіро́ўкай і знайдай

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**жвіро́ўка** — паляўнічая стрэльба з дамаскай сталі;
**шаро́ш** — крохкі лёд, які ідзе ў час крыгаходу;
**зна́йда** (разм.) — сабака, які прывучаны адшукваць дзічыну па следзе;
**зэ́даль** (разм.) — хатняя пераносная лава, услон. *Рабілі зэдаль з карэнішча ці камля з 3—4 ножкамі. З часам зэдаль саступіў месца табурэту і ў наш час амаль выйшаў з ужытку;*
**хаджа́лы** — які многа бываў дзе-небудзь. *Хаджалы чалавек — гэта значыць бывалы;*
**імпэ́тны** — хуткі, парывісты. *У адным з вершаў Зм. Бядулі чытаем:*
*Магутны ты, бо молад ты,*
*Імпэтны, як віхор!*
**хоць патоп** — пра чалавека, абыякавага да ўсяго. *Беларускія сінонімы: абы дзень да вечара, што з гусі вада, і гора мала. Рускія адпаведнікі: до лампочки, ни жарко ни холодно;*
**пасыпаць галаву попелам** — глыбока смуткаваць, перажываць з нейкай прычыны. *Беларусы яшчэ скажуць: кусаць локці, ламаць рукі. Рускія: рвать на себе волосы.*
**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*astashkevich@zviazda.by*

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».***
**6.30, 3.25** М/ф «Тры каты».0
**6.50, 3.45** М/ф «Смяшарыкі».0
**7.10, 4.05** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30, 4.25** «Ералаш».0
**8.30** Серыял «Сямейны бізнес».***
**9.30** Камедыя «Білет на Vegas».***
**11.15** Скетч-шоу «6 кадраў».***
**12.00, 5.10** Серыял «Я лячу».***
**13.00** «Сэрцы за каханне».***
**13.40** «Узважаныя людзі».*
**15.40, 19.00** Серыял «Маладзёжка-4».***
**16.50** Серыял «Закрытая школа-2».***
**17.50, 0.00** «Уральскія пельмені».***
**20.10** Серыял «Кухня-6».***
**21.50** Камедыя «Малавіта».***
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».***
**1.50** Серыял «Месяц».***
**2.40** «Не можа быць!»***

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.40** «Назіральнік».
**11.15** «Блізняты». Маст. фільм.
**12.40** «Бібліятэка прыгод».
**12.55, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.20** «Эрмітаж».
**13.50, 23.50** «Вялікі перапынак». Маст. фільм. 1-я серыя.
**15.10** «Прынцэса цырка». Маст. фільм.
**17.35** «Гюстаў Курбэ». Дак. фільм.
**17.45** Юлія Лежнева, Уладзімір Федасееў і Вялікі сімфанічны аркестр імя П.І. Чайкоўскага.
**18.45** «Рассакрэчаная гісторыя». Дак. серыял.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**21.10** «Майстры Art De Vivre». Дак. фільм.
**21.50** Прыступкі цывілізацыі. «Язычніцкія святыні Ізумруднага вострава». Дак. фільм.
**22.45** «Алена Камбурава. Тэатр маёй душы». Дак. фільм.
**23.45** Мастсавет.
**1.00** «Аляксей Коранеў. Незнакаміты рэжысёр знакамітых камедый». Дак. фільм.
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «КВЗ 87—88». 3-я сустрэча. Каманды НДУ і 1 ЛМІ.*
**7.55** Праграма «Тэма» з У. Ліцыевым: «Таленты і іх паклоннікі». 1993 год.***
**8.40** Маст. фільм «Не бойся, я з табой».***
**11.05, 15.40, 17.00, 20.40, 21.40, 23.00, 2.05, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.*
**11.45** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Мае 6 сотак». 2007 год.*
**12.40** Маст. фільм «Бедная Маша».****
**15.00, 21.00** «Мінулы час».*
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».*
**18.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай: «Творчасць Булата Акуджавы». 2004 год.***
**19.05** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Алег Басілашвілі. «Навошта Вам гэтая сумнўная прафесія?»*
**19.35** Тэлеспектакль «Бабіна царства».***
**23.35** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1963. 2-я частка. 2009 год.***
**0.55** Маст. фільм «Штэпсель жэніць Тарапуньку».***
**2.25** «Быў час». 2010 год.***
**3.25** Маст. фільм «Мы, ніжэйпадпісаныя».***

### EuroSport 1

**4.00, 13.45, 22.00, 2.30** Веласпорт. «Тур Рамандыі».
**5.00, 10.30** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**6.15** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**7.30, 0.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Фінал.
**9.30** Watts.
**11.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы сярод дзяўчат (U-17).
**14.50** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй».
**15.00, 19.00, 1.30** Тэніс. Турнір АТР.
**21.00** Футбол. Юнацкі чэмпіянат Еўропы (U-17).
**23.00** «Найлепшае з коннага спорту».
**23.30** Аўтагонкі. Серыя WTCC.
**0.00** Аўтагонкі. «Формула-3».

### Кінакамедыя

**0.40** Камедыя «Прышэльцы-2: калідоры часу».*
**2.45** Меладрама «Каханне з рызыкай для жыцця».***
**4.20, 14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».***
**5.25** Фэнтэзі «Пенелопа».*
**7.15** Камедыя «Аднакласнікі».***
**8.40** Камедыя «Вампіркі».***
**10.20** Прыгоды «Сіньёр Рабінзон».***
**12.15** Камедыя «Піжон».***
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**16.00** Камедыя «Ёлкі-2».*
**17.55** Камедыя «Дублёр».***
**19.30** Камедыя «Кароль вечарынак».***
**21.15** Камедыя «Юнацтва, якое бунтуе».***
**22.55** Камедыя «Прышэльцы-3: узяцце Бастыліі».*

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.55** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.20** «Доктар I...»
**8.50, 19.00, 2.35** «Вузел лёсу». Серыял.
**10.30, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**12.10** «Сляпая».
**13.10** «Варажбітка».
**14.15** «Паралельны свет».
**15.10** «Вайна нявест».
**15.40** «Здзелка».
**16.10** «Натуральны адбор».
**17.05** «Адкрыта».
**18.00** «Неспакойны ўчастак». Серыял.
**20.50** «Ведзьмакі свету».
**21.50** «Рэвізора».
**22.45, 5.30** «Гісторыі выратавання».
**23.15** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.00** «Элізіум: Рай не на Зямлі». Фантастыка.***
**1.45** «Амерыканскі жаніх».

### ТБ1000

**6.10, 15.30** Жнівень.
**8.30** Блакітная лагуна.
**10.50** Перакладчыца.
**13.30** Акадэмія вампіраў.
**18.10** Выратаванне.
**20.10** Цяжкасці перакладу.
**22.10** Вяртанне ў Блакітную лагуну.
**0.10** Дракула.
**2.35** Выхаду няма.
**4.15** Прыгажосць па-англійску.

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Асаблівасці нацыянальнага палявання.
**8.20** Мамы.
**10.20** Каханне напракат.
**12.20** Пастка для адзінокага мужчыны.
**14.05** Прывід.
**16.15** Тата.
**18.10** Канікулы строгага рэжыму.
**20.20** Ледакол.
**22.40** Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі.
**0.35** Ірэй-сан. Споведзь самурая.
**2.35** Адной левай.
**4.20** Руская гульня.

### National Geographic

**6.00, 13.20** Гульні розуму.*
**6.50, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.55, 14.50** Міжнародны аэрапорт Дубай.*
**8.40, 11.05, 15.35** Ледзяная дарога.*
**9.25** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.*
**10.20, 23.05** Эвакуацыя Зямлі.***
**11.50, 16.20, 19.45, 23.50, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.*
**12.35, 20.30, 2.30** Навука будучыні.*
**17.55, 21.15, 1.25, 4.50** Геній.***
**19.00, 22.20** Пачатак.*

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.*
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Бітвы за кантэйнеры.*
**11.00** Аўтальянцы.***
**17.00, 22.00, 6.20** Махінатары.*
**18.00, 2.00** Геній аўтадызайну.*
**19.00, 1.00** Унікальныя тачкі.*
**20.00, 3.00** Вулічныя гонкі.***
**4.40** Маланкавыя катастрофы.***

## Тэлесеткі

## ГІСТОРЫЯ Ў НОТАХ

**Праект Сталічнага тэлебачання і Міністэрства культуры Беларусі «Залатая калекцыя беларускай песні» працягвае гастрольны тур па краіне.**



Фота: ctv.by.

Першы канцэрт маштабнага фестывалю, як адзначылі ў творчай камандзе СТБ, прайшоў у сярэдзіне красавіка ў Салігорску — з аншлагам. Сваё адчуванне і пераасэнсаванне папулярных кампазіцый прадставілі на суд публікі як зоркі айчыннай эстрады, так і пачаткоўцы. Тэлеверсія канцэрта будзе прадстаўлена ў эфіры 30 красавіка. Тым часам артысты і тэлевізійнікі, а таксама аўтары некаторых шлягераў ужо рыхтуюцца да наступных паездак — па-за межамі сталічнага рэгіёна. 18 мая «Залатая калекцыя беларускай песні» прагучыць для жыхароў Гомеля, а 7 чэрвеня музычная экспазіцыя прыбудзе ў Бабруйск. Усяго ж запланавана правесці 6 маштабных выязных канцэртаў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
*tselyashuk@zviazda.by*

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** Праца быццам бегае за вамі з вялікім сачком, і калі вы своечасова не ўхіліцеся, то давядзецца працаваць не толькі за сябе, але і за таго хлопца. У аўторак магчымыя затрымкі ў справах, з-за якіх вы стоміцеся і пачняце нервавацца, таму паклічце на дапамогу нававаколькіх. У сераду лепш нічога не адкладаць на наступны дзень, зрабіце ўсё тут і цяпер. У другой палове тыдня можаце адчуць новы прыліў энергіі і справіцеся з назапашанымі праблемамі адным махам. Чым больш вы будзеце хваліць блізкіх людзей, тым шчаслівейшымі станеце самі.

**СКАРПІЁН.** У вас вірююць горным патокам пачуцці і эмоцыі, і адной з галоўных задач на гэтым тыдні будзе ўмець імі кіраваць. Стрыманы падыход, прадуманыя крокі дазволяць пазбавіцца ад грузу непатрэбных праблем і дабіцца поспеху ў справах. Стрыманасць аднак не азначае замкнёнасці — не варта хаваць сябе і свае таленты ў чатырох сценах. Не варта спяшацца са зменай месца працы. На старым месцы чакаюцца перамены да лепшага, вам паднімуць заробак. Час схіляе да ўдасканалення прафесійных ведаў, новы праект будзе прыбытковым і цікавым.

**СТРАЛЕЦ.** Не варта ўпарціцца дарма, праявіце разуменне і мудрасць, і ваша слабасць стане сілай. У аўторак магчымыя канфлікты на працы, таму старайцеся стрымліваць эмоцыі. Не спяшаецеся заключаць новыя кантракты. У чацвер многае можа лёгка атрымлівацца, але нічым важным і сур'ёзным усё ж лепш не займацца, бо вялікая імавернасць памылковых дзеянняў. У пятніцу пастарайцеся сканцэнтравацца і не раскідвацца па драбязях. Нядзеля — спрыяльны дзень для добраўпарадкавання дома або дачы.

**КАЗЯРОГ.** Вы мэтанакіраваныя і рашучыя. Упэўненасць у сабе надае сілы. Душэўная раўнавага дазваляе не сумнявацца ў сваім аўтарытэце на працы і дома. Прыслухайцеся да ідэй калег, яны могуць зацікавіць вас новай думкай і з'явіцца вынікам нечаканых планаў. Падумайце пра ўкладанне грошай у адукацыю, сваю ці дзяцей. Знайдзіце дастаткова часу для сябе, каб адкрыць новыя крыніцы натхнення. Выхадныя дазволяць вам адпачыць і ўдосталь нацешыцца жыццём.

**ВАДАЛЕЙ.** Надыходзіць спрыяльны час для рэалізацыі планаў, звязаных з замежнымі паездкамі або далёкімі падарожжамі па сваёй краіне. Добры момант для касметычнага рамонту кватэры, набыцця мэблі, упрыгожвання інтэр'ера. Калі вы незадаволеныя абставінамі, якія складваюцца, то паспрабуйце штосьці змяніць у сабе, астатняе зменіцца само. У аўторак ці сераду магчымыя няўвязкі, якія будуць перашкаджаць рашэнню прафесійных і дзелавых задач, але добрая воля начальства дапаможа іх лёгка ліквідаваць.

**РЫБЫ.** На гэтым тыдні, калі вы зберацеся, то будзеце здольныя здзейсніць скачок у кар'еры. У пачатку тыдня магчымы адказныя перагаворы і кантракты з новымі дзелавымі партнёрамі. Вы справядліва мяркуеце, што ўсяго можаце дамагчыся толькі ўласнымі намаганнямі. Не давайце абяцанняў, пры цяперашнім тэмпе працы вам складана будзе іх выканаць. Ажыццявіць усе планы і задумы будзе не заўсёды проста, але, у прынцыпе, пры мэтанакіраванасці і зацятасці — магчыма.

## Чацвер, 4 мая

### Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.30** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**9.10, 21.45 Серыял «След».*****
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Дыверсант. Канец вайны».*****
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».*****
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.30 Серыял «Позняе раскаянне».*****
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 23.50** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**0.25** Дзень спорту.
**0.35 Серыял «Увага, гаворыць Масква!»*****

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 0.05** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Каханне і іншыя недарэчнасці...»*****
**11.15, 17.00 Серыял «Анжаліка».*****
**12.25, 20.05** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**15.20, 0.10** «Пін_код». Інтэрактыўны моладзёжны праект.
**16.05 Трылер «Тут нехта ёсць...»*****
**21.50** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Паўфінал. Першы матч.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40** «Беларуская кухня». Цыганкі.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 15.35, 20.15** «Гэты дзень».
**8.25 «Д'Артаньян і тры мушкецёры». Маст. фільм. 3-я серыя.***
**9.40** «Майстры і куміры». Народны артыст Беларусі Аляксандр Яфрэмаў.
**10.35** М/ф.0
**11.05, 15.40 «Чыста англійскія забойствы». Дэтэктыў. «Цень смерці». 1-я серыя.*****
**12.20** «Свята далёкай зоркі». Памяці тэатральнага рэжысёра, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Уладзіміра Маланкіна.
**12.45, 20.20 «Грані Перамогі». «Салдаты Перамогі». Частка 1-я.**
**13.00** «Дзённікі беларускага падполля». Гомель.
**13.25 «Згублены ў снягах». Драма.*****
**15.10** «СССР — музыка пад забаронай». Група «Воскресение».
**16.35, 21.05** «Гісторыя ваенных парадаў на Чырвонай плошчы».*
**17.10, 21.40 «Сямнаццаць імгненняў вясны». Серыял.***
**19.35** «Яны спявалі за Радзіму».
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**8.00** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. ВРЗ (Гомель) — «Сталіца» (Мінск).
**9.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/2 фіналу. Першы матч.
**11.30, 20.00** Вольная і грэка-рымская барацьба. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Жанчыны. Фіналы.
**13.25** Фактар сілы.
**13.55** Козел пра футбол.
**14.15** Мастацкая гімнастыка. Этап Кубка свету. Баку.
**17.20** Слэм-данк.
**17.50** Гандбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2018. Мужчыны. Беларусь — Польшча. (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)
**19.30** Авертайм.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/2 фіналу. Першы матч. (У перапынку — PRO спорт. Навіны.)
**0.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/2 фіналу. Першы матч.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.15** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15** «Сёння вечарам».
**16.20** «Адваротны адлік».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Вялікая».***
**23.00** «Вячэрні Ургант».
**23.40** «Іншае «Я» Філіпа Кіркорава».
**0.45** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40, 0.15 «Важняк. Гульня навылет». Серыял.**
**12.30, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**15.35** «У нас усе дома».
**16.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**16.50** «Мінск і мінчане».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**1.55 Маст. фільм «Тупік».*****

### МІР

**6.50** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.30** Добрай раніцы, свет!***
**9.00 Маст. фільм «Аляксандр маленькі».*****
**10.55 Маст. фільм «Флэшка».*****
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем!»***
**14.55** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».*****
**19.20, 4.15 Серыял «Закон і парадак».*****
**22.10 Маст. фільм «Арол і рэшка».***
**23.50 Серыял «Спрут».*****
**2.05 Серыял «Гарачы лёд».*****

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.10** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Скліфасоўскі».**
**19.15, 20.40 Серыял «Асабовая справа».**
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**22.00, 23.10 Серыял «Ціхі Дон».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Дачны адказ».
**7.10, 8.05 Серыял «Час Волкава».*****
**9.00 Серыял «Мухтар. Новы след».*****
**9.45, 22.55** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Ляснік».*****
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Дарожны патруль».*****
**17.05 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».*****
**19.40 Серыял «Марскія д'яблы».*****
**22.25** «Вынікі дня».
**23.15 Серыял «Шэф».*****

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.45** «Сябры дзядулі Марка».
**11.00 Камедыя «Марлі і я».**
**13.00, 19.25 Серыял «Легенды».**
**14.30 Серыял «Палацавыя тайны».**
**15.55, 19.20, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.05** «Мультпарад»: «Браты Грым».
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**16.45 Серыял «Каўчэг».**
**18.15 Серыял «Немзіда».**
**19.10** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Баявік «Іскры з вачэй тваіх».**
**23.30** Дак. фільм «Вяртанне вялікага шамана».

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».***
**6.30, 3.25** М/ф «Тры каты».0
**6.50, 3.45** М/ф «Смяшарыкі».0
**7.10, 4.05** М/ф «Маша і Мядзведзь».0



**7.30, 4.25** «Ералаш».0
**8.30** Серыял «Сямейны бізнес».***
**9.30** Фэнтэзі «Сямейка вампіраў».***
**11.25** Скетч-шоу «6 кадраў».***
**12.00, 5.10** Серыял «Я лячу».***
**13.00** «Лаві момант».***
**13.30, 17.50, 23.35** «Уральскія пельмені».***
**14.00, 20.10** Серыял «Кухня-6».***
**15.40, 19.00** Серыял «Маладзёжка-4».***
**16.50** Серыял «Закрытая школа-2».***
**21.50** Камедыя «Новы хлопец маёй мамы».***
**0.00** Еўрапейскі покерны тур-нір.****
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка».***
**1.50** Серыял «Месяц».***
**2.40** «Не можа быць!»***

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Я крочу па Маскве». Маст. фільм.
**12.30** «Краіна Данелія». Дак. фільм.
**13.25** «Расія, любоў мая!» «Абрады беларускаў-сібіракоў».
**13.50, 23.50** «Вялікі перапынак». Маст. фільм.
**15.10** «Святыні Набацейскага царства». Дак. фільм.
